КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 3 (226) ◂ 21 студзеня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**ДРАМА НА ПАЛЯВАННІ**

Стар. 6

**РАСКОЛАТАЕ ГРАМАДСТВА**

Кожнаму аўтарытарнаму (таталітарнаму) лідару для поўнага шчасця неабходна адзінае грамадства. Такая канструкцыя не мае патрэбы ва ўзгадненні інтарэсаў розных сацыяльных груп, г. зн. у палітыцы

Стар. 4

**ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ТРАГІКАМЕДЫЯ**

Пасля сумнавядомых падзей пасля 19 снежня Беларускі МЗС стаў заложнікам празмернай актыўнасці чэкістаў.

Стар. 12

**ГОМЕЛЬСКІЯ КУРАПАТЫ**

Стар. 15

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10003

**ЧЫТАЙЦЕ
Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВІТАЛЬ ТАРАС:
Я ЖУРНАЛІСТ, БО МНЕ
ГЭТА ЦІКАВА**

Памяці калегі

▸ **МЕРКАВАННЕ**

# ЭФЕКТ САНКЦЫЙ

*Сяргей КАРОЛЬ*

**Ці з'яўляюцца эканамічныя санкцыі супраць рэжыму ў Беларусі тым эфектыўным інструментам, які пазбавіць Еўропу ад яе «апошняй дыктатуры» і дасць беларусам магчымасць сваімі сіламі зарабляць на годнае жыццё?**




Гэтае пытанне рубам паўстала перад заходнімі палітыкамі пасля падзей 19 снежня на плошчы Незалежнасці ў Мінску. І яшчэ больш абвастрылася на фоне хвалі палітычных рэпрэсій, якая не сціхае да гэтага часу. Захад апынуўся перад фактам з'яўлення на ўсходніх межах Еўрапейскага Саюза адкрытага паліцэйскага рэжыму, наяўнасць якога патрабуе новых і больш рэзкіх мераў, чым тыя, што былі скарыстаныя дагэтуль.

Ёсць шмат прычынаў, чаму творцы замежнай палітыкі не любяць і толькі зрэдку скарыстоўваюць эканамічныя санкцыі супраць рэпрэсіўных рэжымаў. Але Беларусь — рэдкі выпадак, калі такія санкцыі могуць адначасова і быць эфектыўнымі, і адчыніць шлях для даўно ўжо наспелых змен з мінімальнымі непажаданымі выдаткамі.

Эканамічны фундамент рэжыму Лукашэнкі вельмі просты, і гэтак жа проста можа быць дэмантаваны. Ён трымаецца на набыцці расійскай нафты (прыкладна за палову рынкавага кошту) і перапрацоўцы яе для продажу спажыўцам у Еўропе па сусветнай цане. З 1994 года такая субсідыя склалася ў суму больш за 100 мільярдаў долараў наўпроставай фіскальнай падтрымкі. Гэта забяспечыла рэжыму ўнутраны крэдыт даверу, як гаранту стабільнасці і адносна высокага дабрабыту, а таксама падатковую плынь на ўтрыманне апарату прапаганды і рэпрэсій.

У 2007 годзе Расія пачала паступова зніжаць субсідыю і практычна цалкам зліквідавала яе ў 2010-м. Амаль год Лукашэнка мусіў жыць без таннай нафты. Наступствы былі імгненныя: замежны крэдыт рэзка ўзрос, пачалі таяць валютныя рэзервы і тут жа, з неверагоднай хуткасцю і відавочнасцю, з «беларускага эканамічнага цуду» выйшла паветра. А з ім і давер насельніцтва. Па дадзеных экзіт-полаў, колькасць галасоў за Лукашэнку 19 снежня была значна ніжэй за 50%. І гэта пры няроўных умовах выбарчай кампаніі і размаху прапаганды ў дзяржаўных СМІ. У адказ рэжым вырашыў перайсці мяжу, якая аддзяляе жорсткі, але папулярны аўтарытарызм ад паліцэйскай дзяржавы.

Галоўны ўрок гэтага вопыту расійскай палітыкі ў адносінах з афіцыйным Мінскам у тым, што эканамічныя санкцыі супраць Лукашэнкі працуюць вельмі эфектыўна. Пратрымаўшы беларускага лідара на дыеце сусветнай цаны на нафту толькі год, Расія атрымала ўсе канцэсіі, якіх шмат гадоў не магла дамагчыся перамовамі. І таму ў снежні 2010-га, напярэдадні выбараў, даравала яму былыя крыўды і фактычна вярнула фіскальную субсідыю на ўзровень 2006 года.

Гэта адкрыла перад беларускім рэжымам пэўныя магчымасці, каб зноў выцягнуць з кішэні сацыяльны пернік, а з ім і значна большую дубіну для нязгодных. Аднак — красамоўная дэталь — як толькі Расіі, ужо пасля 19 снежня, нешта ў паводзінах Лукашэнкі не спадабалася, яна тут жа спыніла пастаўкі нафты ў Беларусь.

Бестарыфная нафта ад Расіі толькі тады субсідыя, калі ёсць пакупнікі прадуктаў з яе перапрацоўкі. Гэтая акалічнасць дае ўнікальную магчымасць нанесці дакладны кропкавы і эфектыўны ўдар у сэрца аўтарытарнага рэжыму.

Усяго толькі юрыдычная мера, якая б забараніла еўрапейскім фірмам мець дзелавыя зносіны з Белнафтахімам, выціснула б эканамічнае паветра з беларускага рэжыму цягам некалькіх месяцаў. Калі ў 2007 годзе ЗША занеслі Белнафтахім у спіс прадпрыемстваў, з якімі амерыканскаму бізнэсу забаронена мець справы (гэты спіс прымаецца Офісам кантролю за замежнымі актывамі Міністэрства Фінансаў ЗША), рэакцыя Мінска была імгненнай і перавысіла ўсе чаканні Дзяржлэпу.

Просты крок амерыканскага ўрада абваліў стратэгію па пранікненні на амерыканскі рынак нафтапрадуктаў, распрацаваную ва ўрадзе Беларусі з мэтай павелічэння фіскальнай плыні ў сваю кішэню.

На той момант экспарт Беларусі ў ЗША дасягаў усяго толькі 200 мільёнаў долараў. Калі ж спыніць тры мільярды экспарту, якія ідуць у краіны ЕС (сума невялікая для таго, каб закрануць інтарэсы еўрапейскіх спажыўцоў), то прастора эканамічнага перніку і паліцэйскай дубінкі скароціцца дастаткова, каб паставіць беларускі рэжым перад неабходнасцю пераасэнсавання метадаў.

Яшчэ адна эканамічная слабасць рэжыму — неабходнасць замежнага фінансавання гандлёвага дэфіцыту. У 2008 і 2009 гадах Расія і МВФ разам прафінансавалі выратаванне Лукашэнкі праз мільярды крэдыту.

У 2010-м урад Беларусі размясціў першы ў гісторыі краіны выпуск вэксальных аблігацый за мяжой на суму ў адзін мільярд долараў, і патраціў іх на перадвыбарныя падвышэнні заробкаў. Зараз урад плануе яшчэ 2,5 мільярда долараў замежных аблігацый. Без фінансавання гандлёвага дэфіцыту, ён мусіў бы дэвальваваць валюту або спыніць падтрымку нерэнтабельных прадпрыемстваў, што хутка б падарвала яго эканамічны фундамент.

Такім чынам, забарона амерыканскім і еўрапейскім інвестыцыйным банкам на крэдытаванне беларускага ўрада і працу па змяшчэнні яго аблігацый у Лондане была б яшчэ адной эфектыўнай санкцыяй.

Але ці не абярнуцца гэтыя меры супраць беларусаў? Здаецца, што не. Беларускія ўлады добра ведаюць, на чым трымаецца іх эканамічны фундамент, і што, знікні навагодні расійскі падарунак, рэсурсу не хопіць і на год. Няма падстаў думаць, што ў 2011 годзе беларусы пагодзяцца доўга пакутаваць за гэты ўрад і хутка разбяруцца, хто вінаваты. Таму, калі санкцыі па нафце і Белнафтахіму будуць прынятыя, рэжым хутка пойдзе на саступкі і — рана ці позна — на сур'ёзныя эканамічныя рэформы.

Вызваленне палітычных зняволеных, спыненне рэпрэсій, забеспячэнне правоў чалавека, сканчэнне палітычнага ціску, эканамічная свабода, гарантыі інвестарам і паступовая лібералізацыя жыцця ў краіне ў абмен на крэдытныя лініі ЕС і прэферэнцыі для інвестыцый, плюс зніжэнне гандлёвых тарыфаў — і ў Беларусі пачнецца сапраўдны эканамічны цуд.

Эканоміка Беларусі, якой яе сёння захоўвае рэжым, — несапраўдная. Гэта мумія савецкай эканамічнай сістэмы, і зараз ужо ўсім зразумела, што яе трэба змяніць. І чым хутчэй, тым меней балюча.

Шаснаццаць гадоў Лукашэнка балансаваў паміж Расіяй і Захадам і тым атрымліваў неверагодныя субсідыі. Гэтую схему проста ліквідаваць, калі запусціць яе ў «рэверсным рэжыме». Зараз, калі стала зразумела, што ўлада не спыніцца ні перад чым, калі відавочна, што самі беларусы гатовыя да зменаў, настаў час павярнуць вентыль фіскальных субсідый і спыніць свой удзел у нафтавых спекуляцыях дыктатуры.

Паток «крывавага паліва» з Беларусі на Захад, на якім зарабляе рэжым, надышоў час спыніць, а потым хутка аднавіць паўнавартасныя эканамічныя зносіны, адчыніць гандлёвыя і фінансавыя прэферэнцыі, ад якіх будуць зарабляць грамадзяне Беларусі, а не вузкі слой яе гаспадароў.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# КАНВЕЕР КДБ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Ператрусы і допыты ў КДБ ідуць патокам. Пасля выбараў мінуў ужо месяц, а кіпучая чэкісцкая дзейнасць не спыняюцца ні на хвіліну. Штодзень па ўсёй краіне адбываюцца ператрусы і допыты.**

Тыдзень пачаўся з вобшукаў у офісе «Вясны» (другога на працягу месяца) і яе кіраўніка Алеся Бяляцкага. У праваабаронцы 17 студзеня правялі ператрус не толькі ў яго кватэры ў Мінску, але і на лецішчы. Канфіскавалі ноўтбук, старыя паперы і дыскі.

Карэспандэнт Радыё «Рацыя» Барыс Гарэцкі арыштаваны на 14 сутак. Яго затрымалі 17 студзеня супрацоўнікі КДБ, калі ён браў інтэрв'ю ў сваякоў палітзняволеных, якія прынеслі ім перадачы ў СІЗА КДБ. На кватэры журналіста, а таксама ў яго брата адбыліся ператрусы. А 18 студзеня суд Маскоўскага раёна Мінска вынес пастанову — 14 сутак арышту. Гарэцкага абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі 19 снежня.

КДБ дапытаў двух намеснікаў старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў. 17 студзеня па крымінальнай справе аб «масавых беспарадках» выклікалі ў якасці сведкі Андрэя Аляксандрава, а 18 студзеня — Аліну Суравец. А кіраўніка Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргея Калякіна ў КДБ паставілі на прафілактычны ўлік. Палітыку заяўлена, што ў яго дзеяннях знойдзена пагроза нацыянальнай бяспецы. Шкоду дзяржаўным інтарэсам, на меркаванні КДБ, наносяць у тым ліку і яго публічныя выказванні.

У Віцебску 17 студзеня па снежаньскіх падзеях дапыталі Канстанціна Халмачова. Падчас выбараў ён працаваў у ініцыятыўных групах некалькіх дэмакратычных кандыдатаў. А моладзевага актывіста Руслана Канавалава выклікалі ў Аршанскі аддзел КДБ. Ён загадзя папярэдзіў следчага, што падпішa пратакол толькі ў тым выпадку, калі ён будзе складзены пабеларуску. Пратакол супрацоўніку КДБ давялося перапісваць некальκі разоў, выпраўляючы граматычныя памылкі. У Наваполацку службоўцы КДБ дапыталі Сяргея Хмарава, які адбыў пасля плошчы 15 сутак у Жодзіне. На сайце Радыё «Свабода» дзвюма часткамі былі змешчаны яго развагі пра акцыю і арышт. «Гэтыя хлопцы падарылі мне натхненне і для трэцяй», — заявіў ён «Свабодзе».

А 18 студзеня адбыўся ператрус у мазырскага актывіста Аляксандра Кавальчука, які быў даверанай асобай кандыдата ў прэзідэнты Віталя Рымашэўскага. Канфіскавалі агітацыйныя матэрыялы, некалькі кампакт-дыскаў з матэрыяламі пра рэпрэсіі 1930-х гадоў. У Мінску 19 снежня актывіста не было, але ў пастанове пракурора напісана, што ён удзельнічаў у «масавых беспарадках». Камітэтчыкі пабачылі выклікаць Аляксандра на допыт. У Віцебску дапыталі Уладзіміра Сіманковіча, намесніка кіраўніка віцебскага штаба Рымашэўскага. А таксама Яўгена Сцяпанава, сябра ініцыятыўнай групы Андрэя Саннікава. А ў Наваполацку 18 студзеня ў КДБ быў дапытаны Аляксандр Брэжнеў. Ні ў якіх выбарчых падзеях хлопец не ўдзельнічаў і ні ў якія каманды кандыдатаў не ўваходзіў. Усяго яго правіннасць у тым, што падчас наведвання іх горада Саннікавым і сустрэчы з выбарцамі ён уручыў кандыдату сімвалічны меч. Ад імя мясцовага рыцарскага клуба.

19 студзеня чэкісты правялі ператрус у офісе «Цэнтра па правах чалавека» і на кватэры яго кіраўніка Раісы Міхайлоўскай. Канфіскаваныя кампутары. На допыт выклікалі экс-кандыдата ў прэзідэнты Віталя Рымашэўскага. А моладзевага актывіста Сяргея Сачыўку затрымалі і даставілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. Актывіста абвінавачваюць у дачы ілжывых паказанняў. Ён быў арыштаваны на плошчы і адбыў 10 сутак у жодзінскім ізалятары. Як вядома, у ізалятарах з затрыманымі таксама праводзіліся допыты.

Папоўніліся і спісы падазраваных і абвінавачаных па крымінальнай справе аб масавых беспарадках 19 снежня. Па звестках «Вясны», абвінавачанымі па справе праходзяць 33 чалавекі, а падазраванымі з'яўляюцца 15 чалавек.

АКЦЫЯ

# НОВЫЯ ЗАТРЫМАННІ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Акцыі салідарнасці з палітвязнямі ў Мінску зноў суправаджаліся затрыманнямі. Як паведамілі праваабаронцы, 22 чалавекі вечарам 19 студзеня дастаўленыя ў Цэнтральны РУУС.**

Людзей затрымлівалі на падыходах да будынку КДБ, дзе меркавалася акцыя. У астатніх яшчэ па дарозе адбіралі партрэты палітзняволеных. Паўсюль было шмат людзей у цывільным, якія паводзілі сябе вельмі нервова і агрэсіўна. Журналістам прыгразілі, што калі яны не будуць трымаць навідавоку акрэдытацыю, іх затрымаюць.

Тыя, каму ўдалося прабіцца да будынку КДБ, запальвалі знічкі, разгортвалі партрэты вязняў. Аднак і тое, і другое службоўцы ў цывільным вырывалі ў людзей. Так, да акцёра Свабоднага тэатра Мікіты Валадзько падышоў адзін з іх і выхапіў свечку. А калі малады чалавек паспрабаваў яе вярнуць, то сказаў Валадзько, што ў хлопца ёсць адна хвіліна, інакш яго акуляры разляцяцца на дробныя кавалачкі.

З партрэтам мужа і знічкай стаяла жонка Аляксандра Атрошчанкава — Дар'я Корсак. Напярэдадні ў яе кватэры быў яшчэ адзін ператрус. Дар'я паведаміла, што не атрымала ад мужа яшчэ ніводнага ліста. А адвакат бачыў яго яшчэ 29 снежня.

Бацька Насты Палажанкі сказаў, што прыйшоў падтрымаць дачку і ўсіх вязняў «амерыканкі», а таксама выказаць свой пратэст супраць таго беззаконня, якое творыцца ў нашай краіне.

Нягледзячы на напружаную атмасферу, акцыя працягвалася каля гадзіны. Людзі проста стаялі, і ў інтэрв'ю журналістам казалі пра сваю падтрымку палітзняволеным.

Асобныя затрыманні былі падчас і пасля акцыі. Аднаго хлопца скруцілі на вуліцы Камсамольскай і запхнулі ў машыну. Журналіста Радыё «Свабода» Алега Груздзіловіча завялі ў КДБ, праверылі дакументы і акрэдытацыю. І прымусілі сцерці кадры, дзе ёсць будынак КДБ.

А машыну, у якой ад'ехала Дар'я Корсак, заблакавалі на вуліцы Валадарскага. Дaішнік спрабаваў прымусіць кіроўцу выйсці з машыны, а побач стаялі асобы ў цывільным. Аднак падаспелі журналісты і фатографы, і службоўцы рэціраваліся.

Гэтым часам ля Чырвонага касцёла запальвалі і ставілі свечкі. Людзі ўвесь вечар ішлі да помніка архангела Міхаіла, спявалі «Магутны Божа», заходзілі ў касцёл. «Я прыйшла памаліцца за здароўе і вызваленне нашых зняволеных, усіх палітычных вязняў Беларусі, — сказала Галіна Сіўчык. — Мы штодня молімся. І, вядома, вельмі хочацца, каб хутчэй гэтыя пакуты ў іх скончыліся. Таму што гэта проста вар'яцтва, што яны зараз знаходзяцца ў вязніцы. І адзінае, што мы можам, гэта толькі звяртацца да Бога за дапамогай».

А Валеры Сядоў са словамі «Свабоду!» паставіў ля знічак партрэт Мікалая Статкевіча. «Чалавек вольны не можа баяцца. Таму што чалавек нявольны — гэта быдла. А мы хочам людзьмі звацца. Жыве Беларусь!» — прамовіў ён. «Чым больш мы баімся, тым больш яны нахабнічаюць. Калі мы не паўстанем супраць гэтага папярэдніка антыхрыста, ён усіх нас зжарэ», — заявіў мужчына. І назваў прозвішча «стаўленіка д'ябла і антыхрыста». За што і быў затрыманы.

З усіх затрыманых дваім прысудзілі штрафы (па 1 млн. 50 тысяч). Астатніх адпусцілі.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# САЦІНТЭРН ПАТРАБУЕ

Альбіна Вішнеўская

**Міжнародная супольнасць чакае, што ўсе арыштаваныя 19 снежня будуць вызваленыя. Неадкладна і без усялякіх умоваў. Пра гэта заявіў падчас свайго прыезду ў Беларусь генсек Сацыялістычнага інтэрнацыяналу Луіс Аяла.**

«Я прыехаў сюды з вельмі яснай мэтай — дабіцца дакладнага разумення, што адбылося ў Беларусі пасля 19 снежня», — адзначыў ён на прэс-канферэнцыі ў Мінску 20 снежня.

«Мы былі вельмі шакаваныя», — пракаментаваў спадар Аяла падзеі ў Беларусі. Паводле яго словаў, існуюць канстытуцыйныя механізмы, каб спраўляцца з узнікаючымі праблемамі, у тым ліку і падчас выбараў. «І мы бачылі 19 снежня, што законныя мэты іх вырашэння не прымяніліся. Шлях вырашэння праблемаў быў зачынены. Узровень гвалту пасля выбараў пераўзышоў усе магчымыя ўяўленні. Асабліва гэта тычыцца дэманстрацыі, якая адбылася пасля выбараў», — лічыць ён.

Сітуацыю з палітвязнямі ў Беларусі Луіс Аяла назваў «непрымальнай». «Мы абавязаны трымацца агульных правілаў, — падкрэсліў спадар Аяла. — Каб былі дэмакратычныя выбары. І гэта правіла працуе паўсюль. Людзі выйграюць і прайграюць выбары. Яны не абавязаны выйграюць усе выбары. І ў палітыцы зараз няма іншых шляхоў. Адзіны сродак — гэта дэмакратычны шлях. Калі ў вас няма дэмакратыі, няма свабодных выбараў, вы проста выключаны з рэгіянальнай супрацы. З усіх арганізацый і інстытутаў. Няма дэмакратыі — ні ў чым не ўдзельнічаеце. Ні ў палітычным, ні ў эканамічным жыцці».

Луіс Аяла 19 студзеня сустрэўся ў Мінску з сябрамі дзвюх сацыял-дэмакратычных партый, прадстаўнікамі штабоў экс-кандыдатаў, праваабарончых арганізацый «Вясна», «Салідарнасць», Цэнтра па правах чалавека і Беларускага Хельсінскага камітэта. Луіс Аяла таксама паведаміў, што Сацінтэрн, адзначаючы прыярытэт беларускай сацыял-дэмакратыі, плануе наладзіць сусветны кангрэс Сацінтэрна 2011 года ў Мінску.

«Ад імя сваіх таварышаў, ад імя сваёй арганізацыі, а таксама проста як чалавек я заклікаю ўлады краіны і прашу прэзідэнта неадкладна вызваліць палітычных вязняў. Усіх, хто быў затрыманы 19 снежня», — зрабіў заяву падчас сустрэчы з журналістамі генеральны сакратар Сацыялістычнага інтэрнацыяналу.

ПАМЯЦЬ

# РАЗВІТАННЕ З ВІТАЛЁМ ТАРАСАМ

Генадзь КЕСНЕР

**19 студзеня на Паўночных могілках пахавалі Віталя Тараса — вядомага беларускага журналіста, публіцыста, пісьменніка.**



Віталь пайшоў з жыцця ў ноч на 18 студзеня пасля цяжкай хваробы, з якой ён мужна змагаўся апошнія два з паловай гады. Нягледзячы на тое, што такая хвароба невылечная, смерць калегі і сябра стала сапраўдным шокам для беларускіх журналістаў, блізкіх да гэтага незвычайна добрага і сціплага чалавека.

Развітацца з Віталём прыйшлі дзясяткі не толькі яго сяброў і калег, але і людзі, якія ведалі яго творчасць, чыталі яго артыкулы, эсэ, кнігі, што ён паспеў выдаць у апошнія гады свайго жыцця. Шматлікія вянкі і безліч кветак. Віталь Тарас быў сябрам беларускага ПЕН-Цэнтра, Беларускай асацыяцыі журналістаў, Саюза беларускіх пісьменнікаў, у 1996 годзе атрымаў прэмію імя Алеся Адамовіча. Працаваў ён на Радыё «Свабода», у некаторых дзяржаўных СМІ, потым пайшоў у аднаўлёную «Нашу ніву», адначасова супрацоўнічаў з Радыё «Рацыя».

Віталь вельмі любіў сваіх родзічаў, сяброў, літаральна абагаўляў сваю сям'ю і асабліва бацьку — слыннага беларускага літаратара Валянціна Тараса, які пайшоў з жыцця два гады таму і побач з якім Віталь знайшоў свой апошні прытулак. Віталь ніколі не паказваў, прынамсі, імкнуўся не паказваць, што яму баліць, хоць хвароба была страшэннай. Мне пашчасціла некалькі хвілінаў пагутарыць з Віталем па тэлефоне ўвечары 8 студзеня, і нават тады, калі яму было вельмі цяжка размаўляць, ён стараўся не паказваць, як яму кепска. І нішто не казала пра тое, што гэта будзе нашая апошняя з ім размова…

На хаўтурах, як і на развітанні дома і на могілках, пра Віталя гучала шмат цёплых слоў — ад Сямёна Букчына і Сяргея Ваганава, Уладзіміра Дзюбы і Рамана Якаўлеўскага, многіх іншых вядомых людзей. Пісьменнік і журналіст Сяргей Дубавец, які быў і хросным бацькам Віталя, падкрэсліў, што ў апошнія гады толькі пачаў раскрывацца сапраўдны талент Тараса як пісьменніка. «Мы ніколі не даведаемся, што і каго мы страцілі», — сказаў узнаўляльнік і былы рэдактар «Нашай нівы».

Цяжкая, вельмі цяжкая страта. Калектыў «Новага часу» выказвае самыя шчырыя спачуванні маці, жонцы і сыну Віталя Тараса, усім родзічам, сябрам і калегам памерлага. Няхай будзе пухам Віталю яго любая беларуская зямля.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПАЧАЛОСЯ?




Сяргей САЛАЎЁЎ

**Мінуў месяц пасля прэзідэнцкіх выбараў. І ўжо бачна, што рацыю мелі апазіцыянеры, а не праўладныя палітыкі-аналітыкі. Бо менавіта апазіцыянеры казалі, што пасля прэзідэнцкіх выбараў нічога не скончыцца, а ўсё толькі пачнецца. І вось, здаецца, яно пачынаецца.**

Цырымонія ўступлення на пасаду наноў абранага прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адбудзецца 21 студзеня, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Мерапрыемства будзе транслявацца па ўсіх каналах Беларускага тэлебачання. Пачатак прамой трансляцыі ў 12.50 па мінскім часе. Цырымонія інаўгурацыі пройдзе ў Палацы Рэспублікі. Пасля яе завяршэння адбудзецца святочны канцэрт майстроў мастацтваў.

Вось толькі гэтае ўрачыстае мерапрыемства з вялікай доляй верагоднасці будзе азмрочана — як звычайна, Захадам. Па неафіцыйнай інфармацыі, у цырымоніі не будзе ўдзельнічаць ніводзін пасол з краін Еўрасаюза. Больш за тое, у гэты дзень яны сяброўскім натоўпам з'едуць з Беларусі ўвогуле. Але гэта яшчэ не самае страшнае, што можа здарыцца.

Напярэдадні інаўгурацыі, 20 студзеня, Еўрапарламент прыняў рэзалюцыю па Беларусі, у якой патрабуе правядзення новых прэзідэнцкіх выбараў.

### Міністру замежных спраў Беларусі Сяргею Мартынаву анулявана запрашэнне на штогадовую Мюнхенскую канферэнцыю па бяспецы

Шмат у чым прынятая рэзалюцыя адпавядае праекту Еўрапейскай народнай партыяй, якае мае самую шматлікую фракцыю ў Еўрапарламенце.

У праекце дакумента, падрыхтаванага ЕНП, Савету ЕС і Еўракамісіі прапаноўвалася перагледзець сваю палітыку ў дачыненні да Беларусі, у тым ліку ў эканамічнай сферы, а таксама неадкладнааднавіць візавыя абмежаванні на ўезд у ЕС для шэрагу беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку прадстаўнікоў судоў і праваахоўных органаў, якія мелі дачыненне да парушэнняў падчас галасавання і рэпрэсій пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года.

ЕС замарозіць усю макрафінансавую дапамогу ў выглядзе крэдытаў МВФ, праграм Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця; замарозіць удзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства» да станоўчых зменаў пачынаючы з «безумоўнага вызвалення прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі»; абмежаваць кантакты з беларускімі ўладамі да «абсалютнага мінімуму»; замарозіць маёмасць «Белтэхэкспарта» і іншых беларускіх экспарцёраў узбраення і ваеннай тэхнікі.

Кіраўніцтва ЕС будзе падтрымліваць развіццё дэмакратыі ў Беларусі шляхам павелічэння фінансавай падтрымкі недзяржаўным СМІ і арганізацыям грамадзянскай супольнасці, колькасці стыпендый для выключаных з ВНУ беларускіх студэнтаў, працягнуць падтрымку Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. А таксама паскорыць падрыхтоўку пагадненняў паміж Беларуссю і ЕС аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі, каб спрасціць кантакты паміж людзьмі.

Так што, магчыма, Аляксандр Лукашэнка будзе вельмі раздражнёны. Не менш раздражнёная будзе і старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына. Ніхто не сумняецца, што яна патрапіць у спіс непажаданых у Еўропе асоб. А яна ж амаль на пенсіі. Не спраўдзіцца, пэўна, ужо ніколі яе мара наведаць Парыж і пасядзець ва французскай кавярні з томікам Хемінгуэя. Вось ўжо сапраўды: «Сядзі дома, вары боршч».

Самае непрыемнае, што гэта ўжо пачало спраўджвацца. Міністру замежных спраў Беларусі Сяргею Мартынаву анулявана запрашэнне на штогадовую Мюнхенскую канферэнцыю па бяспецы. Старшыня канферэнцыі Вольфганг Ішынгер прыняў рашэнне не запрашаць Мартынава «ў знак пратэсту супраць сітуацыі з правамі чалавека ў аўтарытарна кіраванай краіне».

Не патрапіць ў Германію і міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў. Баварскі міністр эканомікі адклікаў запрашэнне міністру эканомікі Беларусі Мікалаю Снапкову ўзяць удзел у канферэнцыі ў Мюнхене. Баварскі міністр заявіў, што з-за апошніх падзей у Беларусі прысутнасць Снапкова на канферэнцыі «непажаданая». Пры гэтым ён не ўдакладніў, ці ідзе размова пра канферэнцыю па бяспецы.

18 студзеня ў прэс-службе МЗС Польшчы паведамілі, што забарона на ўезд у гэтую краіну для шэрагу беларускіх чыноўнікаў ужо ўвайшоў у сілу. «Варшава актыўна ўдзельнічае ў абмеркаванні спісу асоб, якім можа быць забаронены ўезд у Еўрасаюз. Адначасова Польшча падрыхтавала ўласны спіс прадстаўнікоў беларускага рэжыму, якім забаронены ўезд у краіну. Гэты спіс ужо ўступіў у сілу», — падкрэслілі ў прэс-службе. Прозвішчы чыноўнікаў, якім забаронены ўезд на польскую тэрыторыю, не абвяшчаюцца. Але раней паведамлялася, што забаронай на ўезд у Польшчу будуць ахопленыя асобы, адказныя за рэпрэсіі пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня, у тым ліку пракуроры, суддзі, чыноўнікі, супрацоўнікі спецслужб.

Між тым, улады «сінявокай» робяць выгляд, што нічога не адбылося і не адбываецца. Інжынерныя войскі могуць аказаць дапамогу будаўнікам у падрыхтоўцы пляцоўкі для будучай беларускай АЭС. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі 19 студзеня ў Мінску начальнік інжынерных войскаў Алег Воінаў. Паводле яго слоў, «калі будзе такая неабходнасць, калі будзе прынята такое рашэнне, то інжынерныя войскі здольныя выканаць ускладзеныя на іх задачы і дапамагчы ў падрыхтоўцы пляцоўкі».

Супакойцеся, спадар з ваяўнічым прозвішчам! Пасля 19 снежня ніводная краіна не будзе будаваць атамную станцыю ў Беларусі! Ніхто не стане даваць у рукі Лукашэнку нават «самы мірны атам», нават нізкаўзбагачаны ўран. Навошта даваць непрадказальнаму чалавеку тое, з чаго можна зрабіць хай не атамную, але «брудную бомбу». А калі нават знойдзецца такі самазабойца, які рызыкне рэпутацыяй у Еўропе і далейшымі ў дачыненні да яго санкцыямі, то Беларусь папросту не знойдзе грошай яму заплаціць. Таму на планах пабудовы АЭС у Беларусі можна ставіць тлусты крыж.

Так што «зялёныя» могуць святкаваць перамогу, хоць здабылі яе зусім не яны.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ІВАН КУЛІКОЎ



Спецслужбы займаюцца распрацоўкай не толькі тых кандыдатаў у прэзідэнты, што змагаліся да апошняга моманту, але і асобаў, якія сышлі з дыстанцыі на самым старце кампаніі.

Былога прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта Івана Кулікова затрымалі пасля допыту ва Упраўленні ўнутраных спраў Завадскога раёна Мінска. Як перадае БелаПАН, 61-гадовы кандыдат тэхнічных навук, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Кулікоў прыбыў да следчага па позве. Яму дазволілі патэлефанаваць дадому і паведаміць, што ў кватэры будзе праведзены вобшук. Кулікоў пражывае ў пасёлку Сосны, ён з'яўляецца загадчыкам лабараторыі абсталявання ядзерных энергетычных установак Аб'яднанага інстытута энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны».

Ініцыятыўная група Кулікова была зарэгістраваная, аднак подпісы грамадзян за яго вылучэнне кандыдатам здадзеныя не былі.

Цяпер у следчым ізалятары КДБ па абвінавачванню паводле крымінальнай справы па артыкуле 293, частках 1 і 2, Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Масавыя беспарадкі» знаходзіцца 31 чалавек, у тым ліку чацвёра экс-кандыдатаў у прэзідэнты — Аляксей Міхалевіч, Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў, Мікола Статкевіч.

### ЛЯВОН ТАРАСЕВІЧ

Мастак беларускага паходжання родам з Падляшша Лявон Тарасевіч атрымаў з рук прэзідэнта Польшчы ордэн Адраджэння Польшчы «Polonia Restituta» за асаблівыя дасягненні ў галіне культуры. Урачыстасць узнагароджвання творцаў культуры прайшла на Каралеўскім Вавелі ў Кракаве. Ордэн «Polonia Restituta» — другая найважнейшая цывільная ўзнагарода, якая даецца за асаблівыя дасягненні ў галіне асветы, навукі, спорту, культуры, мастацтва.



Лявон Тарасевіч — адзін з найбольш адметных сучасных мастакоў не толькі ў Польшчы, але і ў свеце. У апублікаваным рэйтынгу 2008 года найдаражэйшых польскіх мастакоў на аўкцыёнах у Польшчы Тарасевіч займаў 10-ю пазіцыю: за ягоную карціну, створаную ў 1985 годзе, калекцыянер заплаціў 150 000 злотых (каля 45 000 еўра). Карціна не мае назвы і была створаная пад уражаннем камяністага марскога ўзбярэжжа ў мястэчку Варнэнас, куды Тарасевіч быў запрошаны на пленэр улетку 1985 года.

### МІХАІЛ ЗАХАРАЎ



Пад кіраўніцтвам трэнера Міхаіла Захарава мінскае «Юнацтва» другі раз у сваёй гісторыі заваявала Кантынентальны кубак. 16 студзеня ў трэцім туры суперфіналу, які праходзіў у Мінску, беларуская каманда выйграла ў аўстрыйскага «Рэд Була» з лікам 4:3.

Пасля перамогі над «Рэд Булам» Захараў не хаваў трывогі за вынік бліжэйшых матчаў чэмпіянату краіны. «Вядома, баюся. Ужо гаварыў з хакеістамі на гэтую тэму. Яны ж нап'юцца, а нам ужо з аўторку ў рэжыме «праз дзень» трэба правесці тры вельмі важных матчы з моцнымі супернікамі», — сказаў Міхаіл Захараў журналістам. Трэнер распавёў, што каманда старанна рыхтавалася да турніру. «Вельмі сур'ёзна рыхтаваліся да суперфіналу. І асабліва да матчу з «Рэд Булам». У нас было шмат інфармацыі, уважліва вывучалі відэазапісы з матчаў гэтай каманды. Ведалі, наколькі яна прафесійна падыходзіць да ўсіх пытанняў, у тым ліку і бытавых. У чэмпіянаце краіны матчаў такога напалу ў нас нямнога, можа быць, пяць за ўвесь сезон набярэцца. Таму, адкрыю сакрэт, адмыслова папрасіў нашу федэрацыю хакея ў трох апошніх паядынках перад Кантынентальным кубкам судзіць нас больш строга, часцей выдаляць, нават калі парушэнні не відавочныя, каб мы былі гатовыя да такога арбітражу. Заадно гэта дапамагло нам адпрацаваць дзеянні ў меншасці, бо шмат у чым з-за выдаленняў мы прайгралі «Рэд Булу» ў Кантынентальным кубку год таму ў Грэноблі», — патлумачыў Захараў.

Цяперашні ўладальнік Кантынентальнага кубка ў новым сезоне выступіць у Лізе чэмпіёнаў. Упершыню «Юнацтва» заваявала кубак у 2007 годзе.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# РАСКОЛАТАЕ ГРАМАДСТВА

Сяргей НІКАЛЮК

**Галоўнай навіной навагодняй ночы для беларусаў стала афіцыйнае прызнанне падзелу грамадства на «большасць» і «меншасць».**



Кожнаму аўтарытарнаму (таталітарнаму) лідару для поўнага шчасця неабходна адзінае грамадства. Такая канструкцыя не мае патрэбы ва ўзгадненні інтарэсаў розных сацыяльных груп, г. зн. у палітыцы. У адзінага грамадства — агульны інтарэс, права выяўляць які і бярэ на сябе лідар.

Гэта азбукавая ісціна. Прывяду яе ў разуменні амерыканскага гісторыка Фрыца Штэрна: «З класавай барацьбой будзе скончана; народ зноў стане адзіны; магутны фюрар зноў пачне кіраваць Трэцім Рэйхам; ворагі дзяржавы будуць выгнаныя з краіны, а габрэі, адказныя за ўсе пакуты Германіі, будуць выключаныя з народнай абшчыны, партый больш не будзе; фюрар як усёмагутны дыктатар будзе ўвасабляць волю народа».

На практыцы адзіных грамадстваў не існуе. Гэта не азначае, што ўсе яны расколатыя. Галоўная характарыстыка грамадстваў, якія завяршылі пераход з традыцыйнага стану ў сучаснасць, — наяўнасць агульнай сістэмы каштоўнасцяў (базавага кансенсусу). Што да дэталяў, у якіх так любіць хавацца д'ябал, дык іх колькасць наўпрост залежыць ад ступені развіцця грамадства. Чым больш тое ці іншае грамадства «ўгразла» ў сучаснасці, тым больш дэталяў.

Традыцыйныя грамадствы складаюцца з падданых, сучасныя — з грамадзян, якія ўсведамляюць свае (адрозныя ад дзяржавы) інтарэсы. Для іх рэалізацыі грамадзяне аб'ядноўваюцца ў «гурткі па інтарэсах». Найбольш прасунутыя гурткі з часам трансфармуюцца ў палітычныя партыі.

## Як я стаў «бацькам»

Беларускае грамадства — класічны прыклад грамадства, якое не завяршыла пераход у сучаснасць, і ўжо хаця б таму яно расколатае. Як той, хто ідзе пешкі, не здольны зразумець вершніка, так і большасць «прасунутыя» беларусы не разумеюць сваіх суайчыннікаў, гатовых з пенай у рота абараняць «бацьку». Дасягненне паміж імі згоды немагчымае.

Шмат гадоў я беспаспяхова спрабаваў угаварыць бацькоў жонкі не галасаваць за «адзінага палітыка» (АП). Сёння мая цешча — яго заўзяты апанент, аднак мае асабістыя агітацыйныя здольнасці тут не пры чым. Заўдавеўшы, цешча пераехала да мяне. Яна інвалід і цалкам сябе абслугоўваць ужо не ў стане. Няцяжка здагадацца, што я стаў для яе аўтарытэтам, гэтакім лакальным аналагам «бацькі».

Вось так і беларусы, названыя ў навагоднім звароце «большасцю». Далёка не ўсе яны інваліды, як мая цешча, але ўсе яны не здольныя выжыць у сучасных напаўрынкавых умовах без дапамогі дзяржавы, увасобленай у «адзіным палітыку».

Што да «меншасці» (якая, паводле сацыёлагаў, складае каля 30 працэнтаў беларускага грамадства), то яе ядро — маладыя адукаваныя людзі, якія пражываюць, як правіла, у вялікіх гарадах. Словам, тыя, хто здольныя не проста пасіўна адаптоўвацца да жыцця, але і актыўна яго змяняць.

У кожнай з вылучаных груп — сваё ўспрыманне Беларусі. Звернемся да кастрычніцкага апытання НІСЭПД. Калі сярод тых, хто давярае АП, паляпшэнне матэрыяльнага становішча адзначылі 38% рэспандэнтаў, то сярод тых, што не давяраюць, — толькі 8%. Такое прыкметнае адрозненне ва ўспрыманні сучаснай сітуацыі фармуе і непадобныя малюнкі будучыні. Па меркаванні 50% тых, хто давярае АП, сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў найбліжэйшыя гады палепшыцца. Сярод тых, хто не давярае, аптымістаў усяго 7%.

Табліца дазваляе нам ацаніць стаўленне грамадства да курсу, якім ідзе Беларусь пад мудрым кіраўніцтвам АП. І ў гэтым выпадку мы бачым «большасць» і «меншасць». На пяць прыхільнікаў курсу прыходзяцца тры яго апаненты, і гэтыя суадносіны заставаліся стабільнымі на працягу мінулага года. Дзве апошнія калонкі — яшчэ адно пацверджанне розных ўспрымання Беларусі прыхільнікамі і апанентамі АП.

## Час «думаць пра гэта»

Афіцыйная прэзентацыя факту расколу беларускага грамадства адбылася на наступны дзень пасля падзей на плошчы Незалежнасці падчас прэс-канферэнцыі: *«Но давайте будем честны: 20% или высказались против, или проголосовали за альтернативных кандидатов. Согласитесь, что есть над чем подумать. И я буду думать прежде всего об этом, не забывая о своих сторонниках, о тех людях, которые меня поддержали»*.

16 гадоў Улада спрашчала грамадства, само ж грамадства, насуперак мэтанакіраваным высілкам Улады, ускладнялася. Адбывалася гэта не праз чыйсьці капрыз: грамадства ў сваім развіцці ішло «ад жыцця», а жыццё ўсе гэтыя гады не стаяла на месцы. Што да АП, то ён ускладнення жыцця не заўважаў. Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Папершае, з капітанскага мастка, які размешчаны на вяршыні ўладнай «вертыкалі», шмат што выглядае інакш. А вось для разумення «падругое» нам трэба адкрыць падручнік сацыяльнай псіхалогіі.

Усім нам уласціва рабіць абагульненні, зыходзячы з абмежаванай выбаркі, якая ў першую чаргу ўключае нас саміх (тэорыя «ілжывага кансенсусу»). Гэта спараджае ілюзію, што большасць думае і дзейнічае гэтак жа, як і мы. У апазіцыі і Улады свае абмежаваныя выбаркі. Таму так папулярная сярод апазіцыі перакананасць у падтрымцы большасці, а на вяршыні ўладнай «вертыкалі» — вера ў адсутнасць статыстычна значнай меншасці.

Патрэбна неардынарная падзея, каб запусціць працэс рэвізіі поглядаў на сацыяльную рэальнасць, якія ўжо ўсталіся. Але дэкларавану АП гатоўнасць *«прежде всего думать об этом»* варта разглядаць у якасці першага кроку ў такім накірунку. З гэтага, аднак, яшчэ не вынікае, што ў хуткім часе за першым крокам будзе другі.

## Кожнай пачвары па пары

Раскол беларускага грамадства паўстаў не ўчора. Як адзначалася вышэй, ён спароджаны самім фактам незавершанай мадэрнізацыі. У 1994 годзе ў беларусаў праз збег геапалітычных акалічнасцяў з'явілася магчымасць выбару. Рэальных варыянтаў было два: меншасць выступала за паскарэнне мадэрнізацыі, большасць імкнулася яе затармазіць. Вынік галасавання вызначыла структура грамадства. Выбары прайшлі дэмакратычна — перамога дасталася большасці.

Большасць спарадзіла свайго лідара. За 16 гадоў ён расчараваў сваіх прыхільнікаў. Ад яго чакалі справядлівасці ў размеркаванні, і ён яе забяспечыў. Але любая справядлівасць заўсёды ажыццяўляецца за чыйсьці кошт. Беларускі варыянт справядлівасці прадугледжвае аплату большасці за кошт меншасці. Але такі вектар пераразмеркавання падтрымліваць не так проста, таму такім вялікім быў унёсак вонкавых датацый у беларускую стабільнасць.

За ўсё ў жыцці даводзіцца плаціць. Платай за беларускую стабільнасць з'явілася пагліблэнне першапачатковага расколу. Для таго, каб у гэтым пераканаецца, дастаткова пералічыць знешнія атрыбуты расколу: у рэспубліцы-партызанцы — два саюзы пісьменнікаў, два саюзы журналістаў. Сацыёлагі падзяляюцца на дзяржаўных і незалежных, палітычныя партыі — на канструктыўныя і «так званыя». Любы чытач «НЧ» без цяжкасці можа працягнуць гэты спіс.

У краіне дзве інфармацыйныя прасторы. Яны адлюстроўваюць дзве Беларусі. Паспрабуйце паспрачацца з прыхільнікамі «бацькі». Вашы забойныя аргументы не спрацуюць, бо інфармацыю, размешчаную вышэй побытавага плінтусу, прадстаўнікі большасці чэрпаюць выключна з дзяржаўных СМІ. А там ні табе Вані Ціцянкова з «Торгэкспо», ні тым больш Алкаева з «расстрэльным пісталетам». Там увесну — сяўба, улетку — бітва за ўраджай, увосень — «Дажынкі».

У сваім навагоднім звароце АП прызнаў за меншасцю права мець *«свою точку зрения»*, права на *«особое понимание мироустройства и развития нашей страны»*, якое забраць у меншасці *«никто не может»*. Пляскаць у ладкі я б не спяшаўся. У прынцыпе і ў часы «дарагога Леаніда Ільіча» на права мець свой пункт гледжання ніхто ўжо не замахваўся. Іншая справа — публічна яго выказваць. Тых, хто спрабаваў гэта зрабіць, абвяшчалі дысідэнтамі. Найбольш яркіх, абароненых міжнароднай вядомасцю (Салжаніцын), пазбаўлялі грамадзянства і высылалі. Для астатніх гасцінна расчыняліся дзверы турмаў і псіхушак.

Уздым па левісці прагрэсу не спыніць. Выказваць сваё (адрознае ад афіцыйнага) меркаванне ў нас не забаронена. Але такая шчырасць не сумяшчальная са знаходжаннем у лагеры большасці. А менавіта ў гэтым лагеры робяцца кар'еры і размяркоўваюцца асноўныя грошы.

## Без бутэлькі не разабрацца

IV Усебеларускі народны сход (IV УНС) адбыўся да прызнання АП расколу ў грамадстве. Як жа зараз ацэньваць узровень яго ўсебеларускасці? Вось, да прыкладу, такая цытата: *«Главное — это право народа самостоятельно выбирать стратегию социально-экономического, политического и культурного развития, отстаивать собственные национальные интересы...»*

Калі я спрабую накласці права меншасці на «свою точку зрения» на права *«народа самостоятельно выбирать»*, у мяне ўзнікае стан, які ў псіхалогіі прынята называць «кагнітыўным дысанансам» (дыскамфорт, які выклікаецца супярэчнасцю паміж наяўным уяўленнем і свежай інфармацыяй).

Хто фармуе нацыянальныя інтарэсы? У Трэцім Рэйху — фюрар, які ўвасабляе волю народа. У сучасных дэмакратычных краінах — палітыкі праз складаны механізм узгадненняў. А ў Беларусі?

У звароце ўдзельнікаў IV УНС снежаньскае мерапрыемства вызначана як *«реальный механизм прямого участия белорусского народа в управлении государством»*. Тут ужо без бутэлькі не разабрацца. Дэмакратыя бывае прадстаўнічай і наўпроставай. У першым выпадку народ ажыццяўляе ўладу праз выбарных паўнамоцных прадстаўнікоў, у другім асноўныя рашэнні ініцыюючыя, прымаюцца і выконваюцца непасрэдна грамадзянамі. А гэта азначае, што ў выпадку прамой дэмакратыі грамадзяне прадстаўляюць сябе асабіста і нікога больш!

У грамадствах, якія не завяршылі мадэрнізацыю, няма шанцаў знайсці сваю нішу ў сучасным глабалізаваным свеце. Абвешчаны IV УНС курс на тэхнічную мадэрнізацыю без мадэрнізацыі сацыяльна-палітычнай мае столькі ж шанцаў на поспех, як спроба Гарбачова ўвасобіць у жыццё лозунг: «Больш дэмакратыі, больш сацыялізму!»



**НА ВАШ ПОГЛЯД, У ЦЭЛЫМ СТАНОВІШЧА РЭЧАЎ У НАШАЙ КРАІНЕ РАЗВІВАЕЦЦА Ў ПРАВІЛЬНЫМ ЦІ НЯПРАВІЛЬНЫМ НАКІРУНКУ? (%)**

| Варыянт адказу | 03'10 | 06'10 | 10'10 | Давяраюць АП | Не давяраюць АП |
|---|---|---|---|---|---|
| У правільным | 50 | 50 | 52 | 81 | 18 |
| У няправільным | 36 | 34 | 33 | 9 | 70 |
| Цяжка адказаць/ няма адказу | 15 | 17 | 16 | 11 | 12 |

ДЫРЭКТЫВА

# ПРАГНАЗУЕЦЦА НЕЗВАРОТНАСЦЬ

Вольга ХВОІН

**Да 1 лютага мусіць быць распрацаваны і ўнесены на разгляд урада праекта плана мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктывы № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь».**




Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур паведаміў, што распрацоўкай гэтага дакумента займаецца адмыслова створаная пры Мінэканомікі экспертная група, у якую ўваходзяць прадстаўнікі бізнэс-саюзаў, органаў мясцовага кіравання. «Яны мусяць сабраць прапановы па рэалізацыі дырэктывы ад прадстаўнікоў органаў дзяржкіравання, бізнэс-супольнасцяў, грамадзян», — растлумачыў Андрэй Тур. Такая праца, паводле яго слоў, мусіць спрыяць змяненню мышлення ў прадстаўнікоў тых структур, якія маюць цесныя кантакты з бізнэсоўцамі, напрыклад, гэта тычыцца маёмасных узаемадачыненняў.

## Дзе гарантыі?

Цягам гэтага года Мінэканомікі плануе падрыхтаваць законапраект аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, у якім будуць прапісаныя правы дзяржавы і правы ўласнікаў, аб'екты і сферы дзейнасці, формы і спосабы партнёрства. «Фармаванне заканадаўчай базы па дзяржаўна-прыватнаму партнёрству мусіць зняць недавер да ўлады з боку бізнэсу, які выклікала сітуацыя з канцэрнам «Пінскдрэў», — заявіў Тур. Нагадаю, 3 студзеня Аляксандр Лукашэнка ўказам №2 прызначыў дзяржканцэрн «Беллесбумпрам» кіруючай кампаніяй холдынгу «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў». 10 студзеня падаў у адстаўку генеральны дырэктар «Пінскдрэва» Ларан Арыніч, была распушчаная наглядальная рада. То бок вядуцца размовы аб гарантыях уласнікаў, і адначасова дзяржава ўмешваецца ў кіраванне прадпрыемствам, не маючы ніводнай яго акцыі.

Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур з прыняццем дырэктывы №4 звязвае спадзяванні на развіццё прадпрымальніцва, якое «ў цяперашніх умовах мусіць быць задзейнічана ў поўнай меры». Чыноўнік нагадаў, што ў дакуменце ёсць пункты, датычныя ліквідацыі адміністрацыйных бар'ераў, стварэння інтэрнэт-рэсурсаў для бясплатнага атрымання дакументаў у электронным выглядзе, прынцыпу «аднаго вакна», якое такім будзе насамрэч, і «не трэба будзе хадзіць месяцамі, выбіваючы даведкі». Таксама Тур звярнуў увагу на крокі па лібералізацыі ў частцы кантрольнай дзейнасці. «Цяпер кантрольная дзейнасць мусіць насіць найперш папераджальны характар, а праверкі не павінны парушаць вытворча-гаспадарчую дзейнасць суб'ектаў гаспадарання», — паабяцаў Тур. Намеснік міністра эканомікі зазначыў, што падпісанне дырэктывы робіць немагчымым «адкат назад і адступленне ўладаў ад лібералізацыі».

Старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін, апроч Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, цяпер уваходзіць і ў кансультатыўную раду пры Мігарвыканкаме, якая займаецца выпрацоўкай адпаведных рэкамендацый для ўраду па развіцці бізнэсу. Уладзімір Карагін гаворыць, што ад удзелу ў дзейнасці такіх структур «амбівалентныя адчуванні», але ўсё ж гэта дазваляе «выходзіць на больш высокі ўзровень улады і ўжо такім метадам вырашаць некаторыя пытанні». Суразмоўца зазначае, што ёсць прыклады як эфектыўных, так і не эфектыўных пляцовак дыялогу паміж уладамі і прадпрымальнікамі. «Трэба выпрацоўваць культуру дыялогу. Цяпер дыялог пачаўся, а механізмаў яго вядзення мы не маем. Я ўвесь вольны час выдаткоўваю на пасяджэнні, і хочацца выніку. Думаю, што калі людзі ўдзельнічаюць у стварэнні законаў, то потым яны іх не баяцца. Да ўрада цяпер нельга ісці з лозунгамі, трэба несці разлікі, аналітыку. На гэты год наша задача — распрацаваць законапраект аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, бо той, што ёсць, спісаны з расійскага ўзору і не падыходзіць пад беларускія рэаліі», — гаворыць старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін.

## Пенсійная рэформа

Сёлета Мінэканомікі плануе распрацаваць палажэнне аб перамеркаванні пенсійнай нагрузкі з наймальнікаў на работнікаў. Гэтая праца зойме некалькі месяцаў, але ўводзіцца новая пенсійная сістэма будзе не адзін год. Пераразмеркаванне нагрузкі па пенсійным страхаванні паміж наймальнікамі і працаўнікамі прадугледжана дырэктывай №4. Прадугледжваецца знізіць для суб'ектаў гаспадарання памер адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, якія цяпер складаюць 35 працэнтаў ад фонду заработнай платы прадпрыемства.

Таксама дырэктыва №4 прадугледжвае рэкамендацыйны характар прымянення Адзінай тарыфнай сеткі для прыватных прадпрыемстваў, што павінна спрыяць увядзенню больш гнуткіх умоў аплаты працы работнікаў.

РАЗВАЖАННІ

# ПРАЛОМ ЗАМЕСТ ЗАСЛОНЫ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Паслухаў нeяк на кухні беларускае радыё. Пасля 19 снежня яно, мусіць, застаецца ледзь не адзінай крыніцай пазітыўнай інфармацыі. Перадавалі рэпартаж пра поспехі аграпрамысловага комплексу.**

Па завядзёнцы савецкіх часоў, аддалі належнае планам на будучыню, распавялі пра тое, што ўжо зроблена ці робіцца. У слухачоў такая інфармацыя не выклікае недаверу, бо на самай справе ў краіне будуюцца і новыя фермы, і перапрацоўчыя цэхі, на якіх устанаўліваецца сучаснае замежнае абсталяванне. Прынамсі на Верхнядзвінскім малочным заводзе ўведзены цэх па вытворчасці цвёрдых сыроў па аўстрыйскай тэхналогіі і на аўстрыйскім абсталяванні. Можна сказаць, цэх-аўтамат, дзе вытворчасць кантралюецца кампутарамі, і таму амаль выключаны чалавечы фактар. Нарэшце прыходзяць да нас цэхі-аўтаматы, якія абяцалі толькі пры камунізме.

Журналіст і яго суразмоўцы сыпалі лічбамі, разважалі пра дыверсіфікацыю экспарту і гэтак далей, паводзілі сябе як тыповыя тэхнакраты. Пра чалавечы фактар, мусіць, нечакана для самога сябе выказаўся прадстаўнік Мінсельгасхарчу. Ён лічыць, што беларуская харчовая прадукцыя набывае неблагія перспектывы на рынках трэціх краін, дзе пакуль што вельмі моцныя пазіцыі мае КНР. Але ж у гэтай краіне з кожным годам падвышаецца ўзровень жыцця (растуць заробкі), таму кітайскія прадукты хутка губляюць перавагу ў цэнавай канкурэнцыі.

Не думаю, што Мінсельгасхарч усур'ёз разлічвае палажыць на лапаткі шматмільённага кітайскага вытворцу. Больш цікава іншае — фактычна чыноўнік прызнаецца, што заробкі беларусаў ужо адстаюць ад кітайскіх. Таму мы можам заняць тую нішу недарагіх тавараў, у якой да гэтага часу панавалі кітайцы.

Вядома, што колішні старшыня Савета Міністраў СССР пасля правалу перабудовы рытарычна пытаўся сам у сябе: «Чаму мы не пайшлі па шляху кітайцаў, хто нам не дазваляў рэфармаваць эканоміку на кітайскі манер?» Дасведчаныя людзі яму адказвалі, што гэта было немагчыма з прычыны амаль поўнай адсутнасці кітайцаў у краіне. Гэта значыць, людзей, якія могуць без выходных працаваць па 10–12 гадзін на суткі за жменьку рыса і адзін долар заробку.

Адчуйце пікантнасць моманту — беларусы ўсё яшчэ з пагардай паглядаюць на бедных кітайцаў, хоць на самай справе ўжо даўно вартыя жалю. Магчыма, у параўнанні з жыхарамі




Паднябеснай, у нас яшчэ застаюцца такія-сякія перавагі. Але, мусіць, не надта вялікія. Што тычыцца нашых бліжэйшых суседзяў, то па ўзроўню жыцця мы знаходзімся крышку вышэй за ўкраінцаў. А ўсім астатнім прайграем. Прыкладам, наша сярэдняя заработная плата, якую неймавернымі высілкамі ўлады падцягнулі да 500 долараў, адпавядае мінімальнаму сацыяльнаму стандарту ў Польшчы.

Няма ніякага сумневу, што з цягам часу гэта адставанне будзе павялічвацца. Бо на самай справе матэрыяльны стан людзей залежыць ад мэтаў, якія былі пастаўлены. Тая ж Польшча ўступіла ў Еўрасаюз для таго, каб забяспечыць сваім грамадзянам еўрапейскі ўзровень і якасць жыцця. І гэта мэта не супярэчыць, а цалкам адпавядае палітычным мэтам Еўрасаюзу.

Вось і атрымліваецца, што жалезную заслону паміж Беларуссю і «свабодным светам» мы яшчэ не дэмантавалі, а на яе месцы ўжо пашыраецца і паглыбляецца пралом. Багатым у нас нецікава. Нам, бедным, ехаць да багатых няёмка. Як бы сябе не паводзіў, а тым здаецца, што прыехаў грошы прасіць. Вось такія сумныя наступствы ад рэалізацыі нашай унікальнай сацыяльна-псіхалагічнай мадэлі.

Што праўда, прадукцыя, калі мы яшчэ зможам вырабляць, павінна быць больш таннай, і нейкія грошы ў дзяржавы будуць. Невялікія. Хай нікога не зводзяць у падман велізарныя лічбы, з дапамогай якіх прапаганда стварае афіцыйны партрэт беларускай эканомікі. Сумы мільярдныя, але грошай не хапае, каб залапіць прарэхі на цікавых месцах.

Прыкладам, кажуць, што ад гандлю харчовымі таварамі дзяржава атрымала шмат валюты. Насамрэч, за 11 месяцаў мінулага года іх было экспартавана на 2,6 мільярда долараў. Але ж і імпарт тавараў харчовага або сельскагаспадарчага прызначэння склаў 1,4 мільярда долараў. Такім чынам, перавышэнне экспарту над імпартам — толькі 1,2 мільярда долараў. А з сумы валютнай выручкі трэба выключыць сабекошт сельскагаспадарчай ды харчовай прамысловасці, выдаткі рэалізацыі, удакладніць здабыткі (калі ад іх пасля гэтага нешта засталося) інвестыцыйнымі ўнёскамі ў сельскую гаспадарку, параўнаць рэшту з сумай пратэрмінаванай запазычанасці сельгасарганізацый. І толькі пасля гэтага рабіць высновы — выгодны для нас экспарт сельгаспрадукцыі ці гэта толькі сродак атрымоўваць нейкую валюту для розных хітрых патрэбаў улады.

Насамрэч, стан сельскай гаспадаркі дрэнны. Але і ў іншых галінах справы не нашмат лепшыя. Адмоўнае сальда ў гандлі таварамі, прыкладам, за 11 месяцаў склала больш за 8 мільярдаў долараў. За год будзе больш за 9 мільярдаў. Менавіта на такую велічыню сума імпарту тавараў, што неабходныя для нармальнага функцыянавання і развіцця эканомікі, перавышае суму выручкі ад продажу беларускіх тавараў за мяжой. Не вядома да гэтага часу, як там будзе з нафтай і газам, але кожнаму відавочная нізкая эфектыўнасць нашай эканомікі. Кожнаму, хто вывучаў палітэканомію ў савецкай школе ці вучыўся па заходніх падручніках, відавочна і асноўная прычына такой «безгаспадарчасці». Усе — ад прыбіральшчыцы да міністра — усё робяць з-пад палкі, робяць тое, што загадана, робяць абы як, абы з рук збыць.

Верагодна, таму год ад года не выконваецца паказнік змяншэння рэсурсаёмістасці вытворчасці ВУП. За мінулы год ён павінен быў істотна зменшыцца, а ўдалося эканоміць толькі на 1%.

Міхаіл Мясніковіч, які ўзначаліў урад падчас усіх гэтых палітычныхпературбацый, зараз павінен ламаць галаву, хто і на якіх умовах дасць Беларусі 5–6 мільярдаў долараў, якія патрэбныя, каб утрымаць эканоміку ад натуральнага развалу. А чым аддаваць, калі зарабіць не ўмеем, дый не хочам? Жывем, працягваючы руку кожнаму, у каго ёсць грошы. Пры гэтым красамоўна трымаем яе далонню ўверх.

ЭКАЛОГІЯ

# ДРАМА НА ПАЛЯВАННІ

**За бяскрыўдную навуковую працу ў Дзяржаўнай прыродаахоўнай установе «Заказнік рэспубліканскага значэння «Выганашчанскае» выпускнік біяфака БДУ праз некалькі месяцаў пасля размеркавання расплаціўся агнястрэльным раненнем. І асэнсаваннем таго, што дзе прырода, там і браканьеры, а дзе браканьеры, там і зброя.**



## Як гэта было

Вечарам 22 снежня ў наваколлях вёскі Выганашчы (Івацэвіцкі раён, Брэсцкая вобласць) з агнястрэльнай зброі быў цяжка паранены Мікалай Верабей. Мікалай скончыў біялагічны факультэт БДУ летам 2010 года, кафедру экалогіі і методыкі выкладання біялогіі. У жніўні мінулага года прыехаў на працоўнае месца ў якасці вядучага спецыяліста ДПУ «Заказнік рэспубліканскага значэння «Выганашчанскае».

Знаёмыя расказваюць, што хлопец хацеў практычнай працы, каб быць бліжэй да прыроды. Да ўсяго ў яго было захапленне — фотапаляванне, а праца ў заказніку давала багаты матэрыял для фотасправы. Цікава, што здымкі-пераможцы фотаконкурсу грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» ў 2009 годзе Мікалай рабіў простым фотаапаратам класа «ультра-зум», чым пацвердзіў, што не толькі тэхніка вызначае якасць здымку, але і веды біялогіі, звычак птушак і звяроў.



Падчас вячэрняга абходу фотаанімаліста Мікалая Вераб'я падстрэлілі ў прысутнасці двух сведак на тэрыторыі заказніка, у якім ён працаваў. Мікалай са сваім калегам знаходзіліся ў вёсцы Выганашчы, калі пачулі стрэл. Па інструкцыях, яны мусілі высветліць, хто страляе на тэрыторыі заказніка. Зіма. Па слядах на снезе супрацоўнікі знайшлі ў 500 метрах ад дарогі аўтамабіль і сляды чалавека. Вырашылі пачакаць у старонцы. Пастаялі хвілін 40–50, пабачылі чалавека са стрэльбай. Калега Мікалая выгукнуў: «Лясная ахова, спыніцеся». Той ускінуў стрэльбу, у выніку Мікалай апынуўся на бальнічным ложку з прастрэленымі каленямі, пашкоджанымі суставамі, венамі, адстрэленым пальцам рукі. З-за вялікай страты крыві за жыццё хлопца некалькі дзён змагаліся ўрачы, было некалькі аперацый. Цяпер Мікалай Верабей знаходзіцца ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры траўматалогіі і артапедыі.

Падлоўчы, які страляў у Мікалая, быў з Белавежскай пушчы. Двое яго калегаў у гэты час знаходзіліся непадалёк у хованцы. 23 снежня ў Івацэвіцкім РАУС была заведзеная крымінальная справа па артыкуле 147 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў). Падлоўчага затрымалі, а праз 72 гадзіны адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе.

## Усе адзін аднаго пакрываюць

Знаёмая Мікалая Вераб'я Тацяна (tazinka) напісала ў сваім блогу: «Як выявілася, там дзейнічае цэлая банда падлоўчых і браканьераў, усе адзін аднаго пакрываюць. Кіраўніцтва (улада) свядома наймае на працу падлоўчымі тых, хто быў асуджаны за зладзейства, браканьерства, каб тыя забяспечвалі ім суправаджэнне на паляванні, калі тым трэба». Міліцыянты гавораць, што падлоўчы, які страляў у Мікалая, характарызуецца станоўча, не п'е, не меў праблем з законам, мае сям'ю. Інцыдэнт адбыўся ў працоўны час, калі падлоўчы выконваў службовыя абавязкі, ён мае дазвол на зброю.

Намеснік дырэктара «Белавежскай пушчы», як перадае «Еўрарадыё», сцвярджае, што ў іх не было выпадкаў, каб падлоўчыя арганізоўвалі паляванне для браканьераў або заплюшчвалі на гэта вочы. «З ліку былых браканьераў атрымліваюцца лепшыя ахоўнікі. Яны добра ведаюць і звычкі браканьераў, і звычкі звера, ведаюць месцы, дзе звычайна парушэнні адбываюцца і гэтак далей», — гаворыць службоўца.

## Пакуль не думаю пра працу

Мікалай Верабей цяпер знаходзіцца ў шпіталі ў Мінску. Бліжэйшым часам да яго мусіць прыехаць следчы з Брэста, каб высвятляць акалічнасці здарэння.

— У маі мінулага года Выганашчанская паляўнічая гаспадарка была перададзеная ў апеку Белавежскай пушчы, пасля чаго супрацоўнікам заказніка фактычна забаранілі кантраляваць тэрыторыю. Былі невялікія канфлікты з-за абмежаванняў нашага руху, стала праблематычна вадзіць турыстычныя групы. Яны — землекарыстальнікі, а мы работнікі ўстановы, што знаходзіцца на іх тэрыторыі. Але вялікіх праблем не было.

***— Якія ў вас прагнозы наконт таго, як вырашыцца справа?***

— Пакуль следчы да мяне не прыязджаў, думаю, усё на пачатковай стадыі. Ведаю, што праводзілі следчыя эксперыменты на месцы, што займаецца гэтай справай следчы з Брэста. Гэты чалавек, персанальна гэты, мусіць несці адказнасць за тое, што адбылося.

***— Гавораць, што невыпадковы чалавек вас падстрэліў, былі неадназовыя факты браканьерства.***

— Я адсочваў навіны пра браканьерства ў гэтым рэгіёне, і ведаю, што гэтыя людзі фігуравалі ў некалькіх зводках. Я не знаёмы асабіста з падлоўчым. Так, мы яго гукнулі, ён ведаў, што там людзі. Магчыма, думаў, што адзін чалавек, і хацеў пазбавіцца ад сведкі, думаў забіць. А можа, вырашыў папалохаць і стрэліць па нагах. Там напраўду былі сляды крыві, ён параніў дзіка. Кажуць, што і тушу пазней у тым месцы знайшлі.

***— То бок браканьерства мае месца ў тых мясцінах?***

— Так. Мяркую, што яно пакрываецца зверху, на ўзроўні лясгасаў, паляўнічых гаспадарак. Чаму так? Ёсць спажыва, матэрыяльная зацікаўленасць, грошы.

***— Як вы пачуваецеся, ці не плануеце змяніць сферу дзейнасці?***

— Больш-менш. Часам, праўда, бываюць болі. Яшчэ будуць аперацыі. Дактары гавораць, што на рэабілітацыю спатрэбіцца каля года, таму я пакуль не думаю пра працу.

У Нарачанскім парку ў пачатку студзеня падстрэлілі буйнога расійскага бізнэсмэна. З заявай аб здарэнні падчас дазволенага калектыўнага палявання на дзіка ў Мядзельскі РАУС звярнуўся старэйшы падлоўчы парку. Па словах заяўніка, адзін з паляўнічых атрымаў агнястрэльнае раненне сківіцы. Здарылася гэта раніцай 11 студзеня ў лесе паблізу вёскі Нарач.

Адзін з паляўнічых — генеральны дырэктар санкт-пецярбургскага ЗАТ «Ніка» — страляў па дзіку. Аднак куля адскочыла, магчыма, ад дрэва, змяніла траекторыю і патрапіла ў сківіцу гендырэктара аднаго з філіялаў ААТ «Расійскія чыгункі».

Пацярпелага з аскепкавым пераломам ніжняй сківіцы даставілі ў мясцовую лякарню. Усё акалічнасці здарэння будуць высвятляцца падчас праверак. З месца здарэння забралі зарэгістраваную паляўнічую стрэльбу ТОЗ-34Р, 4 патрона і 14 ладункаў (гільз).

ЗАКОН

# ПАРУШЭННЯЎ НЕ ВЫЯЎЛЕНА

**Пра тое, што ў Беларусь замежнікі ездзяць на паляванне, плацяць вялікія грошы за такі від забавы, — вядома. Супрацоўнікі прыродаахоўных арганізацый гавораць, што не заўсёды госці дзейнічаюць у межах закона.**

Так, грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» прыводзіць прыклад, калі летась у ваколіцах Турава італьянскія паляўнічыя на электронны манок падзывалі качак, у той час як паляванне было дазволена толькі на гусакоў. Сябры АПБ патэлефанавалі на «гарачую лінію» Інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Інспектары паведамілі, што паляванне на левым беразе ракі Прыпяць вядзецца на арандаваных паляўнічых тэрыторыях ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» ў рамках тура для замежных паляўнічых. Але інспектары ўсё ж прыехалі да месца здарэння, у чаўнах знайшлі муляжы качак, але забітых птушак не было. Пры тым, што было зроблена каля дзвюх соцень стрэлаў. Пасля прафілактычнай гутаркі з інспектарамі, замежныя паляўнічыя і падлоўчы ДПУ «НП «Прыпяцкі» былі адпушчаныя без пратаколаў.

Тое, што два прафесійных паляўнічых, расстраляўшы як мінімум па сто патронаў на чалавека, так і не змаглі здабыць ніводнай птушкі, з'яўляецца малаверагодным. Таму адразу ж пасля гэтага было праведзена абследаванне месца размяшчэння схованкі, з якой вялося замежнае паляванне. Ужо пры збеглым аглядзе месца былі выяўленыя тушкі свіязі. Па факце выяўлення мёртвых птушак спецыялісты АПБ, якія праводзілі агляд месца палявання, непасрэдна з месца здзяйснення парушэння паведамілі па тэлефоне ў Тураўскую міжраённую інспекцыю, зрабілі фотафіксацыю факту браканьерства, склалі адпаведны акт.

Але пазней з Дзяржаўнай інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету на зварот ад АПБ прыйшоў адказ, што «дакументальнага, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, пацверджання фактаў парушэнняў Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання не выяўлена».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 24 СТУДЗЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

---

1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 01.00** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.10** Здароўе.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Сямейная меладрама «Радасці і смуткі маленькага лорда» (Расія).
**14.05** Шоў «Вялікая розніца». Частка 2-я.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут лётасці» (Расія).
**17.25** Меладраматычны серыял «Маруся».
**18.25** Праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**22.55** «Эпоха».
**23.25** Баявік «Дублёр» (ЗША).
**01.05** Дзень спорту.
**01.15** Хакей для ўсіх.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.45** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.00** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Як ёсць. Тэхналогіі пераваротаў».
**21.45** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.05** «Праўдзівая гісторыя. Тэгеран-43». Фільм 1-ы.
**00.05** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу».
**00.55** Начныя навіны.

---

ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла. Заключная серыя.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Я-вандроўца».
**13.00** «Ля парадняга пад'езду».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Фартовы». Расія, 2006г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Ундзіна». ЗША - Ірландыя, 2009 г.

---

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.00** Меладрама «Чужая радня» (СССР).
**11.45** Пра мастацтва.
**12.10** Школа рамонту.
**13.10** Прэм'ера. Дакументальна-пазнавальны фільм «Апошні прыстанак піратскай шхуны» (Францыя).
**14.05** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.05** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Тэлебарометр.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі»
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Хакей. КХЛ. Віцязь (Чэхаў) - Дынама (Мінск) У перапынку: Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.00** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Авертайм.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**00.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.00** «Развітанне з пясняром. Уладзімір Мулявін». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**06.10, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.15** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.40** Баявік «Шпіёнскія гульні».

---

EUROSPORT

**04.00, 00.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі. Турнір Вялікага шалома. Дзень 8-ы.
**10.30, 15.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 8-ы. Прамая трансляцыя.
**18.45** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45, 23.30** Біятлон. Кубак свету ў Італіі (Антхольц). Мужчыны. Эстафета.
**21.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Эстоніі. Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.
**01.30** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30, 12.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.45, 12.15** Эксперт.
**08.05, 12.40** ПраСвет.
**08.30** Басаној па свеце: «Малы індзеец».
**08.55, 13.30** Прыватная калекцыя.
**09.25, 14.00** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Мікалай Радзівіл Руды».
**09.30** Дакументальная гадзіна: «Восем месцаў. Вандроўка ў Афганістан», дак. фільм, 2006 г., ЗША.
**10.30** «Тыдзень з жыцця мужчыны», маст. фільм, 1999 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**13.05** Басаној па свеце: «Малы індзеец».
**14.10** Дакументальная гадзіна: «Восем месцаў. Вандроўка ў Афганістан», дак. фільм, 2006 г., ЗША.
**15.10** «Тыдзень з жыцця мужчыны», маст. фільм, 1999 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Час гонару», серыял: 13 серыя.
**18.15** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**18.50** Госць «Белсату».
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «52 адсоткі», дак. фільм, Польшча–Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Проста невырагодна!», маст. фільм, 2001 г., Францыя.
**23.25** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар.

## 25 СТУДЗЕНЯ, АЎТОРАК

---

1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.50** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Маршрут лётасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «3 чорнага ходу» (Расія).
**13.35** «Гладыятары сёння». Відэафільм АТН.
**14.05** Ход у адказ.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Патрабуецца.
**16.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**16.30** «Эпоха».
**17.05** Серыял «Маршрут лётасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**22.55** «Эпоха».
**23.25** Прэм'ера. Маладзевая камедыя «Пераходны ўзрост» (Вялікабрытанія).
**00.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.25** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.30** «Праўдзівая гісторыя. Тэгеран-43». Фільм 2-і.
**00.30** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу».
**01.20** Начныя навіны.

---

ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10, 17.20** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Далёкія сваякі».
**08.50** Фільм «Фартовы». Расія, 2006г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Выкраданне багіні». Серыял.
**23.45** «Інструктар». Серыял.

---

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** Драма «Былыя сябры» (Францыя).
**12.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**13.25** Авертайм.
**14.00** «Запал па культуры».
**14.40** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.40** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Сатырычная камедыя «Гараж» (СССР).
**20.55** «Калыханка».
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** Беларуская часіна.
**22.15** «Уладзімір Высоцкі. Беларускі след». Дакументальны фільм.
**22.50** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.20** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.50** «Спорт-кадр».
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Завяшчанне барона Шчігліца». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** «Загадкавыя суседзі. Крумкачы». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**06.10, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.15** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Следства вялі».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.40** Баявік «Шпіёнскія гульні».

---

EUROSPORT

**04.00, 10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 9-ы. Прамая трансляцыя.
**08.15, 17.15, 19.50** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 9-ы.
**15.15** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**19.45** «Лондан на провадзе». Часопіс.
**20.45** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**21.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба.
**21.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**22.45** Бокс. Міжнародны паядынак.
**00.30** Футбол. Кубак Азіі ў Катары. 1/2 фіналу.
**01.30** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**02.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 10-ы. Прамая трансляцыя.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** Еўропа сёння.
**08.00** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.20** Госць «Белсату».
**08.35** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «52 адсоткі», дак. фільм, Польшча–Расія.
**09.35** «Мой родны горад», серыял.
**10.00** «Час гонару», серыял: 13 серыя.
**10.50, 15.20** «Minsk-Mixt–2008»: канцэрт гурта «Ветах».
**11.05** «Гняздо», серыял: 1 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Еўропа сёння.
**12.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**12.50** Госць «Белсату».
**13.05** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**13.45** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «52 адсоткі», дак. фільм, Польшча–Расія.
**14.10** «Мой родны горад», серыял.
**14.35** «Час гонару», серыял: 13 серыя.
**15.40** «Гняздо», серыял: 1 серыя.
**16.30** «Рэквіем Незалежнасці», дак. фільм.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 21 серыя.
**18.20** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** ПраСвет.
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Мікалай Радзівіл Руды».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня».
**20.15** «Беспрацоўныя», дак. фільм, Польшча.
**20.45** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Доктар Марцін», серыял.
**22.50** Аб'ектыў.
**23.15** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 26 студзеня, серада

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Меладраматычны серыял «Маруся».
**11.40** Відэафільм АТН «Брагінскі кут» цыкл «Зямля беларуская».
**12.10** Дэтэктыў «Паляванне за ценем».
**14.05** Дакументальны фільм «G20. Сеульскі саміт» (Паўднёвая Карэя).
**14.30** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Праграма «Акно ў Еўропу».
**16.30** «Эпоха».
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна). Заключная серыя.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**22.55** «Эпоха».
**23.25** Прэм'ера. Біяграфічная драма «Скура» (Вялікабрытанія - ПАР).
**01.20** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** Асяроддзе пасялення.
**00.30** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу».
**01.20** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Выкраданне багіні». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «Выкраданне багіні». Серыял. Заключная серыя.
**23.45** «Інструктар». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.40** Сатырычная камедыя «Гараж» (СССР).
**12.30** Спорт-кадр.
**12.55** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.45** Медычныя таямніцы.
**14.20** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.15** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) - «Дынама» (Мінск). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.45** Тэлебарометр.
**21.50** Беларуская часіна.
**22.50** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.25** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.55** Рэальны свет.
**00.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Пскоўскі звон. Сны аб страчаным градзе». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.40** «Смяротная зброя. Лёс Макарава». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.10, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.15** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Бываў, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.40** Баявік «Шпіёнскія гульні».

### EUROSPORT

**04.00, 10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 10-ы. Прамая трансляцыя.
**08.15, 23.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Дзень 10-ы.
**15.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Арыгінальны танец. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**18.55** «Спартовае вандраванне». Часопіс.
**19.05** Абранае па серадах.
**19.10** Навіны коннага спорту.
**19.15** Гольф. Тур PGA. Турнір «Bob Hope Classic» (Ла Квінта, ЗША).
**20.15** Гольф. Чэмпіянат Абу-Дабі (ААЭ).
**20.45** Гольф-клуб.
**20.50** Яхт-клуб.
**20.55** Часопіс «Спартовае вандраванне. Конны спорт».
**21.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Пары. Кароткая праграма. Прамая трансляцыя.
**02.00** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** Праект «Будучыня».
**08.00, 12.30** Рэпартэр.
**08.25** Сальда (эканамічная праграма).
**08.40** Беспрацоўныя», дак. фільм, Польшча.
**09.05** «Мой родны горад», серыял.
**09.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.40** Беларусы ў Польшчы.
**10.00** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**10.55** «Бульбаны», мультсерыял.
**11.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 21 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.55** Сальда (эканамічная праграма).
**13.10** Беспрацоўныя», дак. фільм, Польшча.
**13.40** «Мой родны горад», серыял.
**14.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.15** Беларусы ў Польшчы.
**14.30** «Усмешка на вуснах ды слёзы ў вачах», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**15.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**15.45** «Афганец», дак. фільм, Польшча.
**16.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 21 серыя.
**17.00, 19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Доктар Марцін», серыял.
**18.20** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах.
**20.20** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права (прававая праграма).
**21.45** Эксперт.
**22.05** «Выкрадальнікі яек», маст. фільм, 1965 г., ЗША.
**23.40** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

## 27 студзеня, чацвер

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 01.25** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся» (Украіна). Заключная серыя.
**12.10** Меладрама «Важкая падстава для забойства» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** «Сінематэка».
**16.30** «Эпоха».
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Прэм'ера. Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**22.55** «Эпоха».
**23.25** Прэм'ера. Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога» (Расія).
**01.30** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Доктар Тырса». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Тур дэ Франс».
**00.25** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу».
**00.15** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Студэнты International». Серыял.
**15.30** «Выкраданне багіні». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Абанент часова недаступны». Серыял.
**23.50** «Інструктар». Серыял.

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.40** Прыгодніцкі фільм «У пошуках скарбаў тампліераў-2» (Данія).
**12.10** Жансавет.
**12.45** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.45** Дача здароўя.
**14.15** Серыял «Сіла прыцягнення» (Украіна-Расія).
**15.15** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.40** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Трагікамедыя «Бландынка за вуглом» (СССР).
**20.40** Калыханка.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** Беларуская часіна.
**22.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Сакрэтнае дасье. Леў Прыгуноў». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «У лясах і на гарах».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.40** «Паядынак».

### НТВ

**06.10, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.15** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Бываў, «Макараў»!».
**21.30** Баявік «Святаяннік».
**23.15** Сёння.
**23.40** Баявік «Шпіёнскія гульні».

### EUROSPORT

**04.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Жанчыны. 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**08.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. 1/2 фіналу. Прамая трансляцыя.
**13.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**15.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Мужчыны. Кароткая праграма. Прамая трансляцыя.
**19.15** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**19.45** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Пары. Адвольная праграма. Прамая трансляцыя.
**23.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**02.00** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** На колах.
**08.00** Госць «Белсату».
**08.15** Асабісты капітал.
**08.30** Эксперт.
**08.50** Маю права (прававая праграма).
**09.10** «Мой родны горад», серыял.
**09.35** «Доктар Марцін», серыял.
**10.20** «Выкрадальнікі яек», маст. фільм, 1965 г., ЗША.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** На колах.
**12.30** Госць «Белсату».
**12.45** Навігатар.
**13.05** Асабісты капітал.
**13.20** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**13.45** Маю права (прававая праграма).
**14.05** «Мой родны горад», серыял.
**14.30** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**15.15** «Доктар Марцін», серыял.
**16.00** «Дзённік «Народнага альбома», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Выкрадальнікі яек», маст. фільм, 1965 г., ЗША.
**19.05** Маю права (прававая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.20** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Малы індзеец».
**20.45** Хто ёсць кім?: Станіслаў Шушкевіч.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Форум (ток-шоў).
**22.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**23.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**00.10** Аб'ектыў.
**00.35** Гарачы каментар.

## 30 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.45** Дзень спорту.
**07.55** Дакументальны цыкл «Неразгаданая гісторыя» (ЗША).
**08.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Альманах вандраванняў.
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**12.10** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР).
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Прэм'ера. Прыгодніцкае фэнтэзі «Уяўлянарыум доктара Парнаса» (Канада - Францыя - Вялікабрытанія).
**17.45** «OFF STAGE LIFE».
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда».
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Камедыйная меладрама «Закахацца ў нявесту брата» (ЗША).

### ОНТ

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** Пакуль усе дома.
**10.55** Фільм «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа ажаніў».
**12.35** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.05** «Жывы Высоцкі».
**13.20** «Сустрэча з Уладзімірам Высоцкім».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Сустрэча з Уладзімірам Высоцкім». Працяг.
**17.30** Прэм'ера АНТ. «Эстрадны кактэйль».
**18.45** Прэм'ера АНТ. «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** Ток-шоў «Кухня».
**21.40** «Свая каляіна».
**23.50** Фільм «Пагавары з ёй».

### СТВ

**06.30** Фільм «Яна з венікам, ён у чорным капялюшы». СССР, 1987 г.
**07.35** Фільм «Тэлепорт». ЗША - Канада, 2008 г.
**09.00** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Белы Бім - чорнае вуха». СССР, 1976 г. Заключная серыя.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Жыццё гэтага хлопца». ЗША, 1993 г.
**22.50** Фільм «Сем мячоў». Карэя Паўднёвая - Ганконг - Кітай, 2005 г.
**01.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.20** Дабравест.
**07.45** Мір вашай хаце.
**08.00** Прыгодніцкая камедыя «Банзай» (Францыя).
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.30** Школа рамонту.
**11.35** Тэлебарометр.
**11.40** Нашы тэсты.
**12.20** Кінаспробы.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Бухта капітанаў.
**14.05** Прэм'ера. Героіка-прыгодніцкая фантазія «Русічы» (Расія).
**15.55** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - ЦСКА (Масква). Прамая трансляцыя.
**19.20** Гандбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Фінал.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.15** Смешная часіна.
**21.50** Любоўная драма «Індзі» (Украіна-Расія).
**23.35** Культасвет.
**00.05** Канцэрт «ZZ TOP. Live From Texas» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.50** Тэлесерыял «Прынцэса і жабрачка».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Уся Расія».
**12.20** Фільм «Патройная праверка».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса».
**15.40** Прэм'ера. Дакументальны фільм.
**16.40** Фільм «Вялікая сям'я».
**18.35** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Лепшае.
**23.20** «Барыс Ельцын. Жыццё і лёс». Дакументальны фільм.
**00.55** Фільм «Ваш прыпынак, мадам!». 2008 г.

### НТВ

**07.40** Мультфільм «Шайбу! Шайбу!».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**11.00** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.55** «Дачны адказ».
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** Дэтэктыў «Шпількі-2».
**16.20** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.50** «Цэнтральнае тэлебачанне». Першае інфармацыйнае шоў.
**22.00** Прэм'ера. Баявік «Плябан».
**23.50** «Асабліва небяспечны!».
**00.25** «Нерэальная палітыка».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**10.15** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс. Прамая трансляцыя.
**10.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Сестрыер). Жанчыны. Хуткасны спуск і камбінацыя.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Сестрыер). Жанчыны. Слалам і камбінацыя. Прамая трансляцыя.
**15.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145. Прамая трансляцыя.
**16.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Шладмінг). Мужчыны. Слалам і камбінацыя. Шамані (Францыя).
**17.30** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нове Места). Жаночыя спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**18.15** Біятлон. Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Чэхіі (Нове Места). Мужчынскія спаборніцтвы. Гонка пераследу.
**18.55** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**19.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Фінал.
**19.45** Тэніс. Гейм, Сэт і Матс. Часопіс.
**20.00** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Паказальны выступ.
**22.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Вілінген). HS 145.
**23.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі (Мельбурн). Турнір Вялікага шалома. Мужчыны. Фінал.
**01.15** Тэніс. гейм, сэт і Матс. Часопіс.
**01.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы ў Швейцарыі (Берн). Паказальны выступ.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**08.35** «Чароўнае дрэва», серыял.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.25** Форум (ток-шоу).
**10.10** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**10.25** «ПНР дэ люкс», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.40** Вагон.
**10.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Катарга», дак. фільм, 2001 г., Расія.
**11.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.30** «Глядзі, Літва!», дак. фільм, 1996 г., Польшча.
**12.30** Еўропа сёння.
**13.00** «Чароўнае дрэва», серыял.
**13.30** Калыханка для самых маленькіх.
**14.00** «Бардаўская восень–2007»: выступ Касі Камоцкай.
**14.35** «Спадар Забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША, ч. 2.
**16.05** «Ранча», серыял: 28 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 14 серыя.
**18.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**18.25** Дакументальная гадзіна: «Франка: на варце Захаду», дак. фільм, 2006 г., Іспанія.
**19.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Люблінская унія».
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Штодзённае жыццё індзейцаў».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Мядзведзік», маст. фільм, 2007 г., Чэхія.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Балаган».
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый.
Масты: (8 029) 1387994, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга,
(8 029) 625 57 51, Аксана.

### Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюдждвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 625 57 51**

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# СПАРТОВЫ БАЙКОТ

Алег НОВІКАЎ

**Ежы Бузэк у якасці аднаго са сродкаў уздзеяння на беларускі рэжым прапанаваў спартовы байкот. Наколькі эфектыўны такі сродак?**




Цяжка ўзгадаць, калі спорт стаў інструментам палітыкі. Напэўна, піянерамі тут былі нацысты, якія выкарысталі Берлінскую алімпіяду 1936 года для папулярызацыі рэжыму.

І пайшло-паехала. Часам эмоцыі, выкліканыя падзеямі на стадыёнах, выходзілі занадта далёка. Так, у 1969 годзе, пасля таго, як зборная Гандураса па футболу на сваім полі пачала прайграваць камандзе суседняга Сальвадору, у гандураскай сталіцы распачаліся беспарадкі. Па гораду пракацілася хваля гвалту ў дачыненні да грамадзян Сальвадору, уключаючы дыпламатаў і тых самых футбалістаў. Сальвадор у адказ пачаў вайсковыя дзеянні, і толькі аператыўнае ўмяшанне Арганізацыі Амерыканскіх Дзяржаваў не дазволіла канфлікту выйсці на больш высокую ступень эскалацыі.

Часам спорт у палітыцы, наадварот, выконваў функцыю міру. Паляпшэнне адносін паміж Кітаем і ЗША ў пачатку 1970-х пачалося са славутых гульняў у пінг-понг паміж камандамі абедзвюх краін. 6 верасня 2008 года ў Ерэване гулялі зборныя Арменіі і Турцыі — краінаў, якія дасюль маюць напружаныя адносіны з-за армянскага пагрому. На матч у сталіцу Арменіі тады прыехаў турэцкі прэзідэнт Абдула Гюль. Тая гульня стала пачаткам адлігі і ўзаемных кантактах.

Байкот таксама належыць да арсеналу спартовай дыпламатыі.

Натуральна, самымі вядомымі ў гісторыі з'яўляюцца байкот Маскоўскай алімпіяды 1980 года з боку Захаду і байкот краінамі Савецкага блоку алімпіяды ў Лос-Анджэлесе. Як вядома, краіны Захаду байкатавалі Маскву з-за інтэрвенцыі Саветаў у Афганістан. А вось Саветы ў 1984-м не знайшлі лепшай прычыны не ехаць у ЗША, як асабістая небяспека для савецкіх алімпійцаў. Газеты «Правда» і «Известия» ў тыя дні стракацелі рэпартажамі пра размах крыміналу на вуліцах каліфарнійскіх гарадоў.

Былі прэцэдэнты байкоту асобнай краіны з боку ўсёй сусветнай спартовай супольнасці або шэрагу краін. Адной з ахвяраў такога байкоту стала футбольная каманда Ізраілю. Ізраіль быў адным з заснавальнікаў Азіяцкай Канфедэрацыі Футболу, аднак пасля серыі войнаў арабскія краіны рашуча адмовіліся гуляць з ізраільскімі футбалістамі. Закончылася ўсё тым, што Ізраіль падаў заяўку на сяброўства ў UEFA.

Самы вялікі спартовы байкот у гісторыі быў арганізаваны ў 1960–1980-я гады супраць Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР).

У ПАР прынцып расавага падзелу — апартэіду — быў распаўсюджаны таксама на спорт. Існавалі белыя спартовыя федэрацыі і каляровыя. Прычым сябрам другіх было несалодка. Каб не даць ім магчымасці гуляць на міжнародных турнірах, улады папросту забіралі ў іх пашпарты. Былі выпадкі, калі спартоўцы з каляровых асацыяцый спрабавалі прабрацца на міжнародныя турніры нелегальна праз Мазамбік, якія належаў тады Партугаліі. Партугальцы спартыўных «нелегалаў» лавілі, дэпартавалі на радзіму, дзе тых чакала турма.

І менавіта з-за выпадку з адным з такіх каляровых спартсменаў і пачалася гісторыя спартовага байкоту ПАР.

У 1963 годзе на Захадзе ўсіх шакавала навіна пра тое, што Ватва — зорка паўднёва-афрыканскага гольфу — не быў пушчаны ў адзін з тэнісных клубаў, паколькі быў этнічным індусам. Здымак, на якім пакрыўджаны Ватва стаіць пад дажджом каля дзвярэй клубу, абышоў шмат газет свету. Пазней улады ПАР адпомсцілі спартоўцу за тыя публікацыі: яму забаранілі гуляць ва ўсіх турнірах.

Брытанскі камітэт супраць апартэіду адразу звярнуўся з лістом у Міжнародны алімпійскі камітэт (ІОС), патрабуючы выключыць ПАР з міжнародных спаборніцтваў. Наступнымі сталі пісаць пратэсты нацыянальныя алімпійскія камітэты. Найбольш актыўна дзейнічала Індыя. Менавіта з яе падачы ў 1963 годзе зборную ПАР вырашылі не пускаць на алімпійскія гульні ў Токіа, прызначаныя на наступны год.

Санкцыя была разавая. У прынцыпе, каманда ПАР магла быць дапушчаная на Алімпіяду 1970 года ў Мексіку, калі б Прэторыя адмовілася ад формулы захавання расавай стэрыльнасці пры фармаванні сваёй алімпійскай дэлегацыі.

Спартовыя функцыянеры ПАР у адказ на санкцыі ІОС прапанавалі самыя фантастычныя варыянты. Напрыклад, яны былі гатовыя пасылаць на адну алімпіяду белую каманду, а на наступную — каляровую. Па вялікаму рахунку, у апараце ІОС таксама не хацелі канфлікту і гатовыя былі дапусціць нейкія кампрамісныя варыянты. Аднак тут сваё слова сказалі дэлегацыі з афрыканскіх краін. Яны дабіліся выключэння ПАР са складу ІОС.

У выніку дарога ПАР на алімпіяды была зачыненая. Больш таго, пачынаючы з 1980 года на ўзроўні ААН пачаўся маніторынг усіх вонкавых спартовых кантактаў ПАР. Быў складзены ганебны спіс спартсменаў, якія пагаджаюцца ўдзельнічаць у спартовых мерапрыемствах у Паўднёвай Афрыцы. Гэта значыла практычна татальную спартовую ізаляцыю краіны. Так было ў 1985-м, калі ПАР арганізоўвала этап гонкі «Формула–1», шмат еўрапейскіх каманд пад ціскам сваіх урадаў адмовіліся ў іх удзельнічаць.

Праўда, у расістаў былі яшчэ магчымасці дзейнічаць у рамках міжнародных спартовых арганізацый, якія не ўваходзілі ў ІОС. Тут барацьба цягнулася трошкі больш, аднак заканчвалася яна заўсёды стандартным фіналам.

У 1974 годзе паўднёвыя афрыканцы сказалі «бывай» вялікаму тэнісу. Зборная Індыі адмовілася ехаць гуляць у ПАР на фінал Кубка Дэвіса. У выніку Кубак атрымалі паўднёвыя афрыканцы, аднак, напэўна, радасці ад гэтага было няшмат. У тым жа годзе іх выключылі з турніру.

Самая напружаная сітуацыя склалася з рэгбі. У 1968-м кіраўніцтва Міжнароднай Федэрацыі Рэгбі (IRB) адмовілася выстаўляць расістаў за дзверы. Тады грамадскія актывісты пайшлі іншым шляхам. Была створаная арганізацыя «Halt All Racist Tours» («Забарона ўсіх расісцкіх тураў»). Яна арганізоўвала пратэсты супраць тураў зборнай ПАР. Самыя цікавыя падзеі адбываліся ў Новай Зеландыі, дзе даўно склалася традыцыя падобных тураў. У 1981 годзе такі візіт рэгбістаў быў сарваны масавымі вулічнымі пратэстамі. У 1985-м Вярхоўны суд краіны ўвогуле забараніў прыезд каманды. У 1987 годзе «Halt All Racist Tours» дабіліся свайго: IRB выключыў Паўднёвую Афрыку са спісу ўдзельнікаў Кубка свету.

Падзенне рэжыму апартэіду ў 1991 годзе прывяло да вяртання ПАР на міжнародную спартовую сцэну, да дэмакратызацыі і буму спорту ўнутры самой краіны.

Ці быў спартовы байкот эфектыўным? Так. Шмат гісторыкаў прызнае, што факт адсутнасці каманды ПАР на міжнародных спаборніцтвах выклікаў сярод белых паўднёвых афрыканцаў пачуццё прыналежнасці да ізгояў. Байкот падштурхнуў эліту змяніць сваё стаўленне да палітычнай сітуацыі ўнутры краіны.

Аднак для спартовага байкоту трэба прынцыповасць і паслядоўнасць. У выпадку з байкотам ПАР важнае значэнне мела пазіцыя афрыканскіх дзяржаў. Часта іх урады нават кампенсавалі эканамічныя праблемы ўнутры краін гучнымі акцыямі супраць расістаў, у тым ліку на глебе спорту. Аднак, так ці інакш, гэта мела эфект.

Так, перад Алімпіядай 1976 года ў Манрэалі склалася сітуацыя, калі адзінай краінай, якая працягвала падтрымліваць спартовыя кантакты з ПАР, заставалася ўсё тая ж Новая Зеландыя. Афрыканцы патрабавалі ад ІОС не пускаць зборную Новай Зеландыі на Алімпіяду. Чыноўнікі ІОС адмовіліся. Тады дзевяць афрыканскіх дэлегацый папросту сабралі чамаданы і пакінулі Канаду. Алімпійскі камітэт моцна перапалохаўся і пачаў ціснуць на Новую Зеландыю наконт кантактаў з ПАР.

Пакуль цяжка ўявіць, што зборная Германіі або Польшчы пакіне які-небудзь важны турнір з-за прысутнасці на ім каманды з Беларусі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Захаванне ВУП на цяперашнім узроўні было б для беларускіх уладаў вялікай перамогай. Справа ў тым, што знешнегандлёвае сальда Беларусі ўжо некалькі гадоў адмоўнае, а па выніках 2010 года яно значна перавышае 8 мільярдаў долараў. Гэта для Беларусі — вельмі істотная лічба. Як ні імкнуцца ўлады, гэты «мінус» толькі расце. У дадатак і знешні дзяржаўны доўг краіны расце: за час крызісу Лукашэнка напампаваў эканоміку крэдытамі. Утрымаць і не даць патануць беларускай эканоміцы ў дадзенай сітуацыі — ужо сам па сабе цуд. Але, каб рухацца далей, трэба штосьці змяняць. Магчымых шляхоў два: або ў тэрміновым парадку мадэрнізаваць дзяржпрадпрыемствы, якія не бачылі ні тэхналагічных, ні структурных рэформаў ужо вельмі даўно, або спрабаваць адрадзіць у краіне прадпрымальніцкі клас, які Лукашэнка ўласнаручна знішчаў усе гады свайго кіравання.

**«Росбалт» (Расія)**

Пытанне: чаму Лукашэнка павёў сябе так цвёрда? Неабачліва цвёрда, прызвычаіўшыся да таго, што гандаль з Еўропай магчымы заўсёды? Галоўны чыннік складаецца ў тым, што ўпершыню ў Бацькі сталі па-сапраўднаму забіраць народную любоў. Тое, што зрабіў Лукашэнка, — гэта і істэрычная рэакцыя на рэальную палітычную канкурэнцыю, і халодны разлік — задушыць любую канкурэнцыю ў зародку ў надзеі, што яна не прарасце скрозь турэмны асфальт. Але яго праблема ў тым, што апазіцыя прарасце і, магчыма, стане яшчэ больш цвёрдай і адчайнай. Яна адкрыта будзе падтрыманая Захадам. І абараніцца закладнікамі, якіх рэжым Лукашэнка ўтрымоўвае ў жахлівых умовах, ён ужо не зможа. Ніякай дыктатуры ў межах еўрапейскай прасторы ў XXI стагоддзі не будзе.

**«Новая Газета» (Расія)**

Выбарчая кампанія і дэманстрацыя апазіцыі праходзілі мірна. Аднак рэжым Лукашэнкі загадзя падрыхтаваўся да падаўлення мірнай акцыі і зрабіў гэта. Рэжыму, які намагаецца атрымаць легітымнасць з выкарыстаннем сілавых метадаў, відавочна, неабходны праціўнік, які быццам жадае захапіць уладу праз гвалт. І гэты праціўнік — не толькі мясцовая апазіцыя, аднак таксама міжнародная сець спецслужбаў. Такую карцінку мы назіраем з 2001 года. Улады малююць вобраз ворага, які рыхтуе пераварот. Мэта — пазбавіць беларускую апазіцыю легітымнасці і настроіць супраць яе насельніцтва.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Нельга пераацаніць значэнне расійскага фактару: ці гатовая Масква ў той ці іншай ступені далучыцца да эканамічнага ціску на Мінск? На сённяшні дзень такія санкцыі фактычна ўжо дзейнічаюць, расійская нафта з пачатку студзеня не паступае ў Беларусь. Пакуль, як сцвярджаецца, з-за «спрэчкі гаспадарчых суб'ектаў», якая да канца студзеня павінна быць урэгуляванай. А калі не будзе? Да таго моманту, калі ЕС пачне прымаць пэўныя рашэнні па Беларусі, гэтая сітуацыя стане больш яснай. Акрамя таго, высветліцца, на якія саступкі гатовы пайсці Лукашэнка: выпусціць ён палітычных зняволеных ці толькі змякчыць іх становішча, выканае пагрозу забараніць цалкам дзейнасць апазіцыйных палітычных партый або толькі абмяжуе іх правы. Тое, што Бацька вымушаны будзе пайсці на саступкі, відавочна. Пагрозу міжнароднага байкоту Чэмпіянату свету па хакеі, які павінен прайсці праз пару гадоў у Беларусі, для Лукашэнкі можна параўнаць хіба што з перспектывай пазбаўлення яго бацькоўскіх правоў у адносінах да шасцігадовага сына Колі.

**«Ежедневный журнал» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ТУРКМЕНІЯ. СІМ-КАРТА КАШТУЕ 100 ДОЛАРАЎ




Насельніцтва Туркменістана засталося без сотавай сувязі. Дакладна на Новы год замежны аператар МТС пазбавіўся ліцэнзіі. Такім чынам, засталіся без сувязі больш за два мільёна грамадзян. Па самых асцярожных падліках, тут пражывае пяць мільёнаў чалавек. У выніку цяпер у краіне сапраўдная паніка. На рынку застаўся толькі манапаліст — кампанія «Асыр», падкантрольная міністэрству сувязі. Яна да гэтага моманту абслугоўвала прыкладна 400 тысяч кліентаў. Зараз кампанія-манапаліст, не маючы дастатковых тэхнічных магчымасцяў, адмыслоўцаў і досведу, літаральна завалена заявамі грамадзян — былых кліентаў МТС. Скарыстаўшыся сітуацыяй, прадпрымальныя супрацоўнікі сталі прадаваць з-пад палы нумары і сім-карты, якія ідуць за 100 долараў. Таксама прадаецца месца ў чэргах. Газеты гадаюць, што падштурхнула ўрад забраць у МТС ліцэнзію. Паводле афіцыйнай заявы МЗС Туркменістана, гэтае рашэнне звязана з заканчэннем пяцігадовага тэрміна дзеяння дамовы з расійскім аператарам. Незалежныя СМІ кажуць, што ўладам не спадабалася новая паслуга МТС — інтэрнэт, які дазваляе туркменам праглядаць апазіцыйныя сайты. Між тым, расійскі МЗС паабяцаў вярнуць МТС у Туркменію.

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### В'ЕТНАМ. З'ЕЗД КАМУНІСТАЎ



У В'етнаме пачаўся з'езд камуністаў з усімі належнымі атрыбутамі— віншаваннямі піянераў, доўгімі працяглымі апладысментамі, дэкорам з чырвоных сцягоў на вуліцах і г.д. Перад дэлегатамі стаіць задача абраць тройку лідараў (прэзідэнт, генсек і прэм'ер-міністр), якія будуць кіраваць краінай наступныя пяць гадоў. За тыя пасады і разгарнулася вялікая кулуарная барацьба. Змагаюцца некалькі кланаў. Аднак Нгуен Фу Чонг, цяперашні прэзідэнт Нацыянальнай асамблеі, якому стукнула 64 гады, намагаецца захаваць супрацьстаянне, каб гарантаваць сабе месца пасярэдніка. Эксперты кажуць, што ад таго, ці ўдасца яму гэта, і залежаць будучыня краіны. Прадстаўнікі ўсіх кланаў у прынцыпе маладыя людзі, якія бачаць сябе хутчэй паспяховымі заходнімі менеджарамі, чым апаратчыкамі, і таму гатовыя дазволіць своеасаблівы люфт палітычнай свабоды (зараз усе іншыя партыі, акрамя камуністычнай, у краіне пад забаронай). У сваю чаргу, Нгуен Фу Чонг выступае за тое, каб В'етнам канчаткова прыняў «кітайскую палітычную мадэль». Застаецца дадаць, што з'езд праходзіць на фоне цяжкай эканамічнай сітуацыі. Толькі за апошні месяц інфляцыя склала 10 працэнтаў. Сярод в'етнамцаў назіраецца вар'яцкі попыт на замежную валюту.

**Па матэрыялах «Le Soir» (Бельгія)**

### УКРАІНА. ПАДЗЕЛ СУДАНУ ЯК АПРАЎДАННЕ ДЛЯ ПАЎСТАННЯ



Ужгарадскі святар прамаскоўскай праваслаўнай царквы протаіерэй Дзмітрый Сідар, які ўзначальвае палітычны рух русінаў у Закарпацці, выступіў з чарговымі рэзкімі заявамі на адрас Украіны. Ён адзначыў, што русінскі народ «пасля шматлікіх гадоў патрабавання сваіх правоў мае права са зброяй у руках абараняць сваю свабоду». Права русінаў на мяцеж ён матываваў падзеямі ў афрыканскім Судане. Жыхары поўдня Судану на днях дабіліся права на стварэнне незалежнай дзяржавы. Па словах Сідара, «для русінаў суданскі прэцэдэнт можа адыграць сваю ролю. Перш за ўсё, працэс раз'яднання праходзіць мірна, і не дзе-небудзь у Цэнтральнай Еўропе, а ў заўсёды ваюючай Афрыцы. Па-другое, там ужыты той жа фармат, пра які з самага пачатку казалі русіны. Развод адбываецца пад міжнародным кантролем. Па-трэцяе, як і русіны, суданцы прадугледзелі пераходны перыяд. У выпадку, калі Кіеў не дазволіць русінам правядзенне рэферэндуму наконт выхаду краю са складу Украіны, Сідар пагражае цэнтру вайсковым паўстаннем. Застаецца дадаць, што раней СБУ распачала супраць Дзмітрыя справу за замах на тэрытарыяльную цэласнасць і недатыкальнасць Украіны.

**Па матэрыялах сайта Закарпацкая Русь**




ПАДРАБЯЗНАСЦІ



# ДЫПЛАМАТЫЧНАЯ ТРАГІКАМЕДЫЯ

**Іван БІЧ**

**Пасля сумнавядомых падзей пасля 19 снежня Беларускі МЗС стаў заложнікам празмернай актыўнасці чэкістаў.**

«Беларускія дыпламаты вядуць вялікую, у тым ліку і інфармацыйна-азнакамляльную працу з еўрапейскімі палітыкамі для фармавання дасведчанага пункту гледжання на падзеі, якія адбыліся ў Мінску», — такімі словамі характарызуе цяперашнюю дзейнасць МЗС яго прэс-сакратар Міхаіл Савіных.

Вельмі цікава было б папрысутнічаць на сеансах такой працы, паколькі вось ужо месяц пасля Плошчы прайшоў, а «дасведчаны пункт гледжання» не толькі не сфармуляваны, а яшчэ і ўвесь час мяняецца.

Доўгі час афіцыёз даводзіў, што за апазіцыяй стаіць Масква. Калі верыць газеце «Наша Ніва», такую ж версію пасля 19 снежня штурхалі нашы дыпламаты ў Еўропе.

Аднак тэорыя Мартынава супярэчыць тэорыі адміністрацыі. 14–15 студзеня ў «СБ» (друкаваны орган адміністрацыі Лукашэнка) з'явіўся падобны на дэтэктыў опус «За кулісамі адной змовы» — «Перададзеныя па ўказанні кіраўніка дзяржавы для апублікавання ў «СБ» рассакрэчаныя дакументы аб падзеях 19 снежня». Змоўнікамі тут выступаюць Берлін і Варшава.

За адсутнасцю нават больш-менш узгодненай афіцыйнай версіі ўсе намаганні МЗС прыпыніць махавік увядзення санкцый выглядаюць апрыёры смешнымі. Не кажучы пра тое, што хваля ператрусаў і арыштаў, якія працягваюцца ўжо месяц, маральна дыскрэдытавала рэжым.

Нават Даля Грыбаўскайтэ, якая яшчэ ўчора была галоўным адвакатам рэжыму, здала яго. Нават верны саюзнік Зюганаў заявіў, што будзе прасіць літасці для вязняў Амерыканкі.

У выніку нашым дыпламатам заставалася прыняць канструктыўную позу статыстаў і назіраць, як усе іх напрацоўкі апошніх гадоў ператвараюцца ў пыл.

Ужо на канец першага тыдня новага 2011 года рассыпаўся прабеларускі блок у ЕС. Пасля Італіі пра падтрымку санкцый заявілі Латвія і Літва.

Адзінае, што яшчэ магло грэць душу дыпламатам, намер літоўцаў абмежавацца мяккім варыянтам.

«Санкцыі павінны ўжывацца супраць канкрэтных прадстаўнікоў улады, якія прымаюць рашэнні, удзельнічаюць у іх ажыццяўленні або распаўсюджваюць і абараняюць гэтыя рашэнні», — сказаў Данус Сямашка, дарадца прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ.

Аднак рэзюме слуханняў па Беларусі ў Еўрапарламенце, якія прайшлі 12 студзеня, засведчылі, што літасці не будзе.

Апранутыя ў бел-чырвона-белыя шалікі еўрадэпутаты пастанавілі, што прэзідэнцкія выбары ў Беларусі не адпавядалі міжнародным стандартам, асудзілі рэпрэсіі ў дачыненні да мірных дэманстрантаў 19 снежня ў Мінску, а таксама арышты і затрыманні, заклікалі ЕС перагледзець адносіны з РБ.

Яшчэ адзін кепскі знак для беларускіх уладаў — адзінства поглядаў ЕС і ЗША. 14 студзеня, пабываўшы ў Беларусі, сенатар Рычард Дурбін сказаў: «Дзеянні беларускіх уладаў, якія арыштавалі больш за 600 апазіцыйных актывістаў, а таксама тое, што пяць кандыдатаў у прэзідэнты былі арыштаваныя, а яшчэ два кандыдаты застаюцца ў статусе падазраваных па крымінальнай справе, ствараюць не вядомы раней у сусветнай палітыцы прэцэдэнт. У краіне не можа быць дэмакратычнай формы кіравання, калі пройгрыш на выбарах Лукашэнку азначае накіраванне наўпрост у турму».

Пасля пасяджэння ў Брусэлі варта было чакаць перапынку ў працэсе раздачы Мінску дыпламатычных аплявухаў. Толькі 20 студзеня Еўрасаюз мусіў прыняць рэзалюцыю.

Аднак «СБ» сваімі дэтэктывамі не дала нікому расслабіцца. Агучаныя тэзісы пра польскіх і нямецкіх шпіёнаў выклікалі адпаведную рэакцыю ў Варшаве і Берліне.

МЗС Польшчы назваў «драматычнымі, прапагандысцкімі, набліжанымі да абсурду намаганнямі» заявы газеты «Советская Белоруссия».

17 студзеня з неафіцыйных крыніцаў стала вядома, што ў польскім МЗС падрыхтаваны спіс асобаў, адказных за рэпрэсіі. Ён уключае пракурораў, суддзяў, чыноўнікаў, супрацоўнікаў спецыяльных службаў.

Пасол Беларусі ў Германіі Андрэй Гіро быў выкліканы ў нямецкае МЗС, дзе яму было заяўлена пра абсалютную безгрунтоўнасць абвінавачванняў афіцыйнага Берліна ў дачыненні да «спробы дзяржперавароту» ў Беларусі. Патрыцыя Флор — упаўнаважаная МЗС Германіі па Усходняй Еўропе, Каўказу і Цэнтральнай Азіі — выразна падкрэсліла, што «падобныя абвінавачванні абсалютна безгрунтоўныя», паведамляюць германскія СМІ.

Думаецца, не без уліку расследаванняў «СБ» дэпутатамі фракцыі Народнай Партыі ў Еўрапарламенце 18 студзеня быў складзены беспрэцэдэнтна жорсткі, варыянт рэзалюцыі па Беларусі.

Партыя заклікае органы Еўрасаюза спыніць усю фінансавую падтрымку Беларусі і ўдзел ва «Усходнім партнёрстве», замарозіць маёмасць «Белтэхэкспарта» і іншых экспарцёраў узбраення і ваеннай тэхнікі, замарозіць усю макрафінансавую дапамогу ў выглядзе крэдытаў ад МВФ, а таксама праграмаў Еўрапейскага інвестыцыйнага банка і Еўрапейскага банка развіцця і рэканструкцыі; абмежаваць кантакты з беларускімі ўладамі да «абсалютнага мінімуму».

На фоне адкрытага ціску з боку Захаду не зразумелая сітуацыя на ўсходнім фронце. Як пажартаваў адзін эксперт, калі Еўропа толькі плануе ўводзіць эканамічныя санкцыі, то Расія іх даўно пачала. Гутарка пра пастаўкі нафты. Масква, праўда, ніякага палітычнага падтэксту ў гэтым не бачыць. У Крамлі кажуць пра дзяжурны *«спор хозяйствующих субъектов»*. Аднак нейкае варушэнне ў Маскве адбываецца. Пра гэта сведчыць цэлая серыя заяў Смаленскай плошчы: патрабаванне вярнуць журналісту «Коммерсанта» акрэдытацыю, антылукашэнкаўскія ролікі ў выпусках праўладных СМІ, інтарэс да лёсу расіян, якія сядзяць у беларускім ізалятары.

Цяпер застаецца дачакацца, калі на пасяджэнні міністраў замежных спраў краін ЕС спіс і фармат санкцый будзе непасрэдна прыняты. Цікава, ці знойдуць да гэтага часу Якубовіч і Мартынаў кампраміс па пытанню, якія шпіёны (нямецкія, расійскія, польскія, балгарскія, аргенцінскія і г.д.) арганізавалі падзеі 19 снежня? І ці ўвогуле былі тыя шпіёны?

ПРАВЫЯ

# ЛІФТЫНГ ДЛЯ ПАРТЫІ

Алег НОВІКАЎ

**Прыход Марыны Ле Пэн на пасаду кіраўніка французскай праварадыкальнай партыі Нацыянальны фронт (НФ) выклікаў шырокія дэбаты наконт будучыні краіны і еўрапейскай дэмакратыі.**


Марына Ле Пэн

Жан-Мары Ле Пэн сышоў на пенсію, пакінуўшы сваім прыхільнікам створаную ім калісьці партыю, якая ў дадатак знаходзіцца ў зеніце папулярнасці. Адпаведна апошнім апытанням, рэйтынг Нацыянальнага фронту складае каля 20 працэнтаў.

Цяпер мала хто памятае, што калісьці было інакш. Калі ў 1972 годзе Жан-Мары — былы дэсантнік і дэпутат — заснаваў Нацыянальны фронт, яму прадказвалі лёс вечнага маргінала. На першых выбарах за партыю Ле Пэна прагаласавала 0,74 працэнта выбаршчыкаў.

І толькі ў сярэдзіне 1980-х усе зразумелі, што ён зрабіў правільныя інвестыцыі. Атрымаўшы ў 1984-м на выбарах у Еўрапарламент 11 працэнтаў, НФ увайшоў у вышэйшы дывізіён французскай палітыкі, дзе застаецца дасюль. У 2002 годзе Ле Пэну ўвогуле ўдалося нешта фантастычнае: у першым туры прэзідэнцкіх выбараў ён абставіў сацыяліста Ліанэля Жаспена і аказаўся ў другім туры, дзе, праўда, не меў ніякіх шансаў супраць Жака Шырака.

Выводзячы Нацыянальны фронт у топ, Ле Пэн адначасова змагаўся з крамолай унутры партыі. Прычын для канфліктаў хапала. Недзе напрыканцы 1990-х да іх дадалася яшчэ адна — Марына. Стала відавочна, што менавіта сваю дачку бацька Нацыянальнага фронту бачыць на пасадзе пераемніка. У 1998-м з-за «кумаўства» ў партыі нават адбыўся раскол.

Фронда супраць дачкі шэфа працягвалася і пазней, пакуль Марына не давяла, што яна чагосьці вартая. У 2007 годзе ўся Францыя сачыла за выбарамі мэра ў маленькім эльзаскім рабочым гарадку Энін-Бамон, дзе балатавалася Марына Ле Пэн. Спачатку ёй удалося выйсці ў другі тур. Тады ўсе левыя і лібералы гораду аб'ядналіся ў Рэспубліканскі фронт, каб не дапусціць Марыну на пасаду мэра. У выніку яна ўсё ж прайграла, аднак зарабіла сабе імідж вельмі моцнага і перспектыўнага палітыка. Калі яшчэ праз два гады яе бацька сабраўся сыходзіць, кандыдатуру Марыны ніхто не аспрэчваў. І вось 16 студзеня на з'ездзе НФ Марына Ле Пэн, кажучы савецкім журналісцкім штампам, «прагнула сямейную працоўную дынастыю».

Прыход Марыны на пасаду кіраўніка партыі актыўна каментуе не толькі палітычная, аднак і бульварная прэса. Ніколі ў гісторыі лідарам ультраправай партыі, ды яшчэ самай масавай у Еўропы, не была жанчына. Адсюль вялікая цікавасць да яе прыватнага жыцця. Дарэчы, Марына замужам за бізнэсмэнам. У яе трое дзяцей.

Што да палітычных каментатараў, то ім цікава, як Марына паўплывае на грамадскую палітычную дыскусію. Фронт пераабраў кіраўніка ў час глабальнай рэцэсіі. Як сведчыць гісторыя, у такой атмасферы радыкалы адчуваюць сябе як рыба ў вадзе.

Даніэль Кон-Бендзіт, лідэр французскіх Зялёных, параўнаў цяперашнюю сітуацыю з 1968 годам, калі грамадства таксама страціла давер да старой палітычнай эліты. Гэта быў час палярызацыі і радыкалізацыі грамадскай думкі. Адны тады шукалі альтэрнатыву ў вучэнні Маркса, другія марылі пра рэжым моцнай рукі. Па словах Кон-Бендзіта, сёння мы зноў назіраем, як крайнія левыя і правыя полюсы набіраюць моц. Флагманамі левых становяцца эколагі і антыглабалісты. На правым флангу тон задаюць партыі кшталту НФ. Рост палітычнага ўплыву як першых, так і другіх здольны цалкам змяніць еўрапейскі дыскурс і ЕС.

Пры гэтым і Зялёныя і нацыянал-папулісты дастаткова аморфныя ідэйныя праекты. Вызначаць фізіяномію апошніх будуць такія палітыкі, як Марына Ле Пэн.

На цяперашні момант для дыскурсу ультраправых характэрныя новыя тэндэнцыі. Самым важным момантам з'яўляецца перанос увагі з расавага пытання на пытанне эміграцтаў, і перш за ўсё з мусульманскіх краін.

У якасці аргумента супраць эміграцтаў ультраправыя мусоляць тэорыю сутыкнення дзвюх цывілізацый, у нашым выпадку еўрапейскай і ісламскай. «Алжыр стаіць каля варот Парыжу», — любіў казаць Жан-Мары Ле Пэн. Развіваючы тэзісы марксіста Антоніа Грамшы пра тое, што вялікая палітыка — працяг паўсядзённага жыцця, правыя адкрылі для сябе паняцце «культурны фронт». Будаўніцтва мінарэтаў і публічнае нашэнне паранджы разглядаюцца як замах на еўрапейскую ідэнтычнасць. Трэба дадаць, што ў Францыі з часоў Трэцяй Рэспублікі праводзіцца цэнтралізаваная культурная палітыка. Паралельная культурная актыўнасць у выглядзе сеткі ісламскіх школ часам успрымаецца французамі як падрыў рэспубліканскіх прынцыпаў.

Акцэнтаванне ўвагі на ісламскай пагрозе дазволіла Нацыянальнаму фронту пазбавіцца ад міфаў антысемітызму, прапаганда якіх не дазваляла яго сябрам доўгі час стаць сваімі сярод эліты. Узнікае пагроза альянсу правых і кансерватараў. Пакуль, праўда, Сарказі рашуча адмаўляецца супрацоўнічаць з правымі радыкаламі.

Пытанне — ці гэта ім трэба? Важным следствам стаўкі на ісмламафобію стаў канфлікт з кансерватарамі школы Тэтчэр і Рэйгана, якая разглядае эміграцыю як нейтральную з'яву, а часам нават пазітыўны эканамічны чыннік.

Акрамя таго, ідэя ўстанавіць шлагбаум для эміграцтаў і надаць прэферэнцыю ўсяму нацыянальнаму набыла сярод правых больш шырокую трактоўку. Папулярная ўтопія нацыянальнай дзяржавы як формы супрацьстаяння выклікам крызісу і эфектам ліберальнай глабалізацыі. Фронт ужывае «левую» рыторыку, патрабуючы «павялічыць ролю дзяржавы ў эканоміцы, выпрацаваць палітыку супраць спекуляцый на біржы і прыняць план падтрымкі спажывецкай здольнасці насельніцтва». Апалагетыка тэорыям Кейнса на мяжы з антыеўрапейскімі заклікамі наўрад ці падабаецца Сарказі і яго электарату.

Менавіта тут, на думку палітолагаў, ляжыць слабасць і моц Нацыянальнага фронту. Ён не можа ісці на саюз з ліберaламі, паколькі гэта пазбавіць яго рэнаме партыі альтэрнатывы. 79 працэнтаў сяброў НФ супраць ідэі падобнага альянсу. Аднак прырастаць партыя можа толькі за кошт выбаршчыкаў Сарказі, якія, як правіла, дасюль бачаць у Нацыянальным фронце тусоўку расістаў і сацыяльных маргіналаў, якія сваю нядзольнасць зарабіць на жыццё спісваюць на арабаў-стрэлачнікаў.

Вырашаць дылему Марына збіраецца за кошт палітыкі «dédiabolisation», сэнс якой — мадэрнізаваць партыйны дыскурс, надаць яму больш гуманныя рысы. Яна лічыць, што новы імідж Нацыянальнага фронту дазволіць яму стаць нармальнай правай партыяй і канкураваць на роўных з галістамі. Паглядзім, што ў яе атрымаецца.

Дарэчы, адна з любімых, не характэрных для правых тэм Марыны, — барацьба супраць інстытуту кансерватыўнай сям'і. Яна ахвотна згадвае, што ў дзяцінстве мела шмат канфліктаў з аўтарытарным бацькам, з-за чаго рана збегла з дому. А ў дадатак яшчэ нават спрабавала падпаліць сямейны асабняк.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЭВА МАРАЛЕС



Прэзідэнт Балівіі абвясціў пра пачатак незвычайнай кампаніі. Яе мэта — рэабілітацыя кокі, расліны, з якой вырабляюць какаін. Па словах балівійскага гаранта, лісце кокі чамусьці ўспрымаецца адмоўна, як наркотык. Між тым, лісце кокі — частка традыцыйнай культуры індзейцаў і жыхароў Лацінскай Амерыкі. Больш таго, яе спажыванне (лісце жуюць) — добры медычны сродак. Непасрэдна кампанія Маралеса накіравана супраць прынятай у 1961 годзе ААН канвенцыі пра неабходнасць знішчэння плантацый кокі як базавай сыравіны для вытворчасці какаіну. Афіцыйная Багата кажа, што гэта было памылковым рашэннем. Цяпер Балівія мае намер дабіцца перагляду той рэзалюцыі. Першым этапам кампаніі стане тур міністра замежных спраў Балівіі па краінах ЕС. Яму пастаўленая задача — схіляць еўрапейскіх дыпламатаў да перагляду канвенцыі ад 1961 года. Па словах прэзідэнта, некаторыя лідары ў кулуарных размовах ужо паабяцалі Маралесу падтрымку. Эксперты лічаць, што рэабілітацыя лісця кокі патрэбна Балівіі, каб пачаць экспарт. Відавочна, што дзякуючы міфам, створаным вакол лісця кокі, іх з'яўленне ў аптэках выкліча моцны інтарэс з боку спажыўцоў.

### РАШЫД ГАНУШЫ



Самы вядомы ісламіст у Тунісе, які з-за пераследу ўладаў у свой час быў вымушаны пакінуць краіну, цяпер, пасля падзення рэжыму Бен Алі, вырашыў вярнуцца на радзіму. Святар не хавае, што марыць паўтарыць поспех іранскага мулы Хамейні. Апошні, як вядома, вярнуўся ў Іран з эміграцыі пасля антышахскай рэвалюцыі і змог навязаць суайчыннікам мадэль ісламскай рэспублікі. Праўда, сам туніскі Хамейні кажа, што арыенцірам для яго з'яўляецца не Іран, а Турцыя, якой зараз кіруюць памяркоўныя ісламскія кансерватары. Так ці інакш, у Тунісе ў 69-гадовага Рашыда хапае прыхільнікаў. Яны аб'яднаныя ў партыю «El Nahda» (адраджэнне). «El Nahda», якую ў 1990 годзе забараніў Бен Алі, дзейнічае ў падполлі і налічвае каля 30 тысяч актывістаў. Самога Рашыда, калі партыю забаранялі, абвінавацілі па крымінальным артыкуле — удзел у змове супраць прэзідэнта. У апошні момант праваднырy «El Nahda», аднак, удалося збегчы ў Лондан. Адтуль ён увесь час вёў прапаганду супраць Бен Алі, робячы націск на тым, што туніскі рэжым падтрымлівае перш за ўсё Парыж. Як сцвярджаў Рашыд, гэта ёсць лепшы доказ антыісламскага характару дыктатуры былога прэзідэнта. Між тым, пакуль урад вайскоўцаў, які прыйшоў на змену Бен Алі, не дазваляе вяртання ў краіну палітычных эмігрантаў.

### МАРЫЯ МАЦІАС




Украінская пісьменніца, якая здавалася далёкай ад палітыкі, апынулася ў цэнтры гучнага палітычнага скандалу. Усяму віной нядаўняя кніжка Маціас пад назвай «Вирвані сторінки з автобіографії». На яе старонках яна, між іншым, параўноўвае помнік перамогі ў Кіеве з фаласам. Гэта аналогія выклікала ярасць Саюза ветэранаў, які падаў заяву ў пракуратуру. Сваe пяць капеек дадалі камуністы, якія праз Вярхоўную Раду патрабавалі канфіскацыі накладу кніжкі. Хутка справа прыняла незвычайны характар. У кватэры пісьменніцы і ў выдавецтве, дзе друкавалася кніжка, прайшліператрусы. Што шукаюць следчыя, не зразумела. У любым выпадку, гісторыя Марыі зацікавіла «аранжавую» апазіцыю. Арсен Яцэнюк, лідар партыі «Фронт пераменаў», і дэпутат Вячаслаў Кірыленка (партыя «За Украіну») выступілі ў падтрымку літараткі. Як кажа Яцэнюк, «гаворка ідзе пра ператварэнне дзяржавы ў дыктатуру, калі кантроль устанаўліваецца таксама над думкамі грамадзян, літаратурай. Адраджаецца стылістыка 1970-х». Кірыленка ўвогуле заявіў, што ва ўладзе непісьменныя людзі. Сама Маціас, здаецца, вельмі напужаная падзеямі і просіць пракуратуру ўдакладніць, у чым яе віна.

▸ РЭЙТЫНГ

# «КОН» УЛАДЗІМІРА НЯКЛЯЕВА — КНІГА–2010 «НОВАГА ЧАСУ»

Алесь ГІНЗБУРГ

**6 жніўня 1517 года ў Празе пабачыла свет першая друкаваная беларуская кніга. Гэта быў «Псалтыр». Яе аўтарам быў біблейны цар Давід, а перакладчыкам, рэдактарам і выдаўцом — палачанін Францыск Скарына. Добра, што хаця б першая кніга — гістарычна ўстаноўлены факт. Бо сёння здаецца: спрэчка пра тое, якая ж беларуская кніга найлепшая, ніколі не аціхне. Дзеячы беларускай культуры працягваюць падводзіць кніжныя вынікі 2010 года.**

Падвядзенне кніжных вынікаў ужо зрабілася традыцыяй у нашай неафіцыйнай культуры. Балазе, беларускія культурныя інстытуты, якія бяруцца за такую адказную справу, так маргіналізаваныя нашым «схільным» да культурнага дыялогу дзяржапаратам, што спрос з іх невялікі: чытай, ацэньвай, абвяшчай. Чырвоных дарожак, імёнаў у канвертах, грашовых падарункаў і іншых прыкметаў прэстыжу тут, зазвычай, няма. А дабрае слова — яно ўсім даспадобы.

Самымі грунтоўнымі на сёння можна назваць рэйтынгі газеты «Наша ніва» і Радыё «Свабода». Гэтыя СМІ запрашаюць экспертаў — уладальнікаў кнігарань, крытыкаў, літаратуразнаўцаў — і вызначаюць найлепшую кнігу паводле набраных балаў. Не бракуе ў прэсе і індывідуальных рэйтынгаў. І калі літаратурныя крытыкі імкнуцца падкрэсліць сваю староннасць і незалежнасць у справе ацэнкі, то супрацоўнікі выдавецтваў наадварот — судзяць толькі сваё, фактычна, сяродзяцей сваіх выбіраюць. Колькі кніг — столькі і меркаванняў.

## НАЙЛЕПШЫЯ КНІГІ ПА ВЕРСІІ «НОВАГА ЧАСУ»

Любы рэйтынг — справа суб'ектыўная. Калі кніга не фігуруе ў нейкім спісе — гэта не значыць, што яна нявартая. У Беларусі гэта толькі падкрэсліваецца, і чытаючае грамадства ўжо прызвычаілася ставіцца да розных экспертных ацэнак з разуменнем і нават з гумарам. Ацэнкі экспертаў адначасова агаляюць галоўныя праблемы кнігагандлю краіны. Кнігі рэгіянальных выдавецтваў не трапляюць у сталіцу, а сталічных — у рэгіёны. А ва ўшанаванні таго ці іншага аўтара паводле мастацкіх вартасцяў не на апошнім месцы — палітычныя крытэры. Рэклама кніжных навінак, лічы, адсутная, інстытут крытыкі — у стагнацыі... Рэйтынгі і прэміі сёння — ці не адзіны спосаб зрабіць цікавую кнігу заўважнай.

Усвядоміўшы гэта, культаглядальнікі «Новага часу» вырашылі апытаць супрацоўнікаў газеты з нагоды кніг, якія яны ўпадабалі цягам мінулага года. Паколькі такая апытанка ладзіцца намі ўпершыню, мы пакінулі ў аўтарскіх рэйтынгах і кнігі, выдадзеныя ў годзе 2009. Для беларускага кніжнага рынку — гэта, можна сказаць, навінкі.

Рэдакцыйны выбар кнігі–2010 «Новага часу» лічым невыпадковым і сімвалічным.

### Вольга Хвоін, палітаглядальнік

1. Свидетельствуют палачи. Уничтожение евреев на оккупированной территории Беларуси в 1941–1944 гг.: документы и материалы. Минск: НАРБ, 2010




«Вельмі ўражвае сухая мова, без эмоцый: «расстралялі стольки, габрэі займаліся тым і тым, забралі ў іх столькі шуб, столькі ботаў»... Людзі, якія камандавалі расстрэламі, расказваюць пра іх, як пра бытавыя рэчы».

2. Захар Шыбека. Гарадская цывілізацыя. Беларусь і свет. Вільня: ЕГУ, 2009.

«Пазнавальна. Мноства дробязяў, як, напрыклад, звесткі пра публічныя дамы ў Мінску. І ўвогуле — нечаканы разрэз жыцця сталіцы канца XIX — пачатку XX стагоддзя».

3. Рышард Капусцінскі. Імперыя. Мінск: Логвінаў, 2009.

«Гэтую кнігу я б увяла ў абавязковы курс журфаку «Як ствараць у рэпартажы эфект прысутнасці».

### Генадзь Кеснер, палітаглядальнік

Валерий Карбалевич. Александр Лукашенко. Политический портрет. Москва: «Партизан», 2010. — 720 стр.

«Не мог уявіць, што так хутка праглыну такую аб'ёмную кнігу. Я не мог адарвацца!»

### Барыс Пятровіч, рэдактар дадатку «Літаратурная Беларусь»

«Тры найлепшыя кнігі года ў алфавітным парадку»:

1. Міхась Андрасюк. Вуліца добрай надзеі. Мінск: Медысонт, 2010.

2. Уладзімір Някляеў. Кон. Вершы двух стагоддзяў. Мінск: Лімарыюс, 2010.

3. Андрэй Хадановіч. Несіметрычныя сны. Мінск: Логвінаў, 2010 (Серыя «Кніга+аўдыё»).

### Анатоль Мяльгуй, музычны аглядальнік

«Найлепшыя кнігі пра музыку»:

1. Зміцер Сасноўскі. Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст. Мінск: Харвест, 2010 (серыя «Неизвестная история»).

2. Вітаўт Мартыненка. Рок-online. Мінск, 2010.

3. Яраш Малішэўскі, Аксана Спрынчан. Незвычайная энцыклапедыя беларускіх народных інструментаў. Мінск: Мастацкая літаратура, 2010.

### Андрэй Расінскі, кінакрытык

«Фотаальбом года» — Андрэй Лянкевіч. Паганства /Andrei Liankevich. Pagan. На беларускай і ангельскай мовах. Крынкі (Польшча), Дом друку «Arx Baltica», 2010.

### Марыя Мартысевіч, культаглядальнік

Найлепшы «фікшн». Курт Вонегут. Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак. Пераклад і пасьлямова Паўла Касцюкевіча. Мінск: Логвінаў, 2010 (Серыя «Бібліятэка Бацькаўшчыны).

Найлепшы «нон-фікшн»: Вольга Бабкова. ...І цуды, і страхі. Мінск: Логвінаў, 2010 (серыя «Галерэя Б»).

Найлепшы зборнік паэзіі: Алесь Разанаў. Воплескі даланёю адною. Пункціры. Мінск: Логвінаў, 2010.

### Алег Новікаў (Лёлік Ушкін), замежны аглядальнік

«Найлепшыя кнігі, якія мне падаравалі іх аўтары — мае карэфаны»:

1 .Сяргей Календа. Помнік атручаны людзям. Апавяданні, мініяцюры. Мінск: Галіяфы, 2009.

2. Міхась Башура. Думкі — гэта не гульня. Вершы. Мінск: Галіяфы, 2010.

3. Зміцер Вішнёў. Замак, пабудаваны з крапівы. Мінск: Галіяфы, 2010.

### Аляксей Кароль, шэф-рэдактар

0. Виктор Мартинович. Паранойя. Москва: АСТ; Астрель-СПб, 2009.

«Хаця кніга выдадзена ў мінулым годзе, але глыбінны падтэкст яе напоўніцу раскрыўся толькі ў гэтым годзе, асабліва на фоне снежаньскіх падзей».

1. Уладзімір Някляеў. Кон. Вершы двух стагоддзяў. Мінск: Лімарыюс, 2010.

«Рэдкі выпадак нават для сусветнай гісторыі, калі паэт пацвярджае свае вершы сваёй жыццёвай пазіцыяй, учынкамі ў палітыцы. На адно́лькава высокай ноце таленту і мужнасці».

2. Генадзь Бураўкін. Лісты да запатрабавання. Вершы і паэмы. Мінск: Кнігазбор, 2010.

### Кніжныя вынікі 2010 года: агляд рэйтынгаў

**«Наша ніва»** вызначала найлепшыя кнігі ў дзвюх намінацыях.

Найлепшая мастацкая кніга: Уладзімір Караткевіч. Ладдзя Роспачы. Першае непадцэнзурнае выданне. — Мінск: Медысонт.

Найлепшая гістарычная кніга: Мікола Ермаловіч. Выбраныя творы. Укладанне і каментар К. Цвіркі; прадмова А. Грыцкевіча. — Мінск: Кнігазбор (серыя «Беларускі кнігазбор»).

**Радыё «Свабода».** Кніга года — Ларыса Геніюш. Збор твораў у 2 тамах. Укладанне, прадмова і каментары М. Скоблы. Мінск: Лімарыюс (серыя «Галасы Айчыны»).

**Валянцін Акудовіч** для праграмы Радыё «Свабода» «Пяцікніжжа свабоды»:

Сонца тваё не закоціцца, і месяц твой не схаваецца. Укладальнік Ірына Дубянецкая. Мінск: «Тэхналогія», 2010 (Кніга прысвечана 80-годдзю з дня нараджэння і 50-годдзю святарства айца Аляксандра Надсана, беларускага грэка-каталіцкага святара, апостальскага візітатара беларусаў-каталікоў замежжа).

**Павел Касцюкевіч,** прэс-дырэктар выдавецтва «Логвінаў» — для блогу выдавецтва (найлепшая кніга па выніках года і водгуках чытачоў) — Міказль Ніемі. Папулярная музыка з Вітулы. Раман. Пераклад са шведскай Вольгі Цвіркі (серыя «Кнігарня «Наша Ніва»).

**Зміцер Вішнёў,** сузаснавальнік выдавецтва «Галіяфы» — для сайту грамадскай кампаніі «Будзьма!»:

Юры Станкевіч. П'яўка (сумесны праект з выдавецтвам «Каўчэг»).

**Ганна Кісліцына** для газеты «Звязда»:

Найлепшая кніга прозы — Юры Станкевіч. П'яўка. Мінск: «Галіяфы».

Найлепшыя кнігі паэзіі — Адам Глобус. Новае неба. Мінск: Галіяфы; Андрэй Хадановіч. Несіметрычныя сны. Мінск: Логвінаў.



ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ

# ГОМЕЛЬСКІЯ КУРАПАТЫ

Таццяна УЛАСЕНКА

**За Гомелем, на дзявятым кіламетры Чарнігаўскай шашы, пачынаецца Шчакатоўскі лес, які цягнецца да самай украінскай мяжы. Гэта «лес смерці», названы так незалежнымі СМІ, які павялічвае спіс жалобных месцаў Беларусі, дзе ўсталяваны мемарыяльныя крыжы. Калісьці тут была выяўлена вялікая колькасць магіл. Яшчэ за савецкімі часамі праз шматлікія пахаванні працягнуўся газаправод. Рабочыя ўвесь час натыкаліся то на косткі, то на ямы з чалавечымі парэшткамі. Лес выдаў страшную таямніцу недалёкага мінулага. А грамадскасць не магла пакінуць без увагі яшчэ адну прыадчыненую старонку гісторыі.**



У гэтым лесе ў 1937 годзе НКУСаўцы расстрэльвалі мірных людзей

Па сведчаннях жыхароў з навакольных мястэчак, у гэтым лесе ў 1937 годзе НКУСаўцы расстрэльвалі мірных людзей, у тым ліку жыхароў Чарнігаўскай вобласці, якіх прывозілі сюды пад покрывам ночы. Вядома, такая інфармацыя патрабавала дасканалай праверкі. Рабочыя, якія былі задзейнічаны на пракладцы газапровада, распавядалі, што гэту зямлю з чалавечымі косткамі ўвесь час кудысьці вывозілі. Асноўная частка зямлі з косткамі пайшла на ўтрамбоўку аб'яздной дарогі вакол Гомеля. Астатняе, па сведчаннях людзей, адправілася ў кірунку ракі Сож.

Да перабудовачных працэсаў у Савецкім Саюзе тэма сталінскіх рэпрэсій карпатліва замоўчвалася. Таму толькі напачатку 1990-х гадоў Гомельская абласная пракуратура разгарнула працу.

На паверхню былі паднятыя чалавечыя астанкі, гільзы, фрагменты вопраткі і абутку. Экспертыза вынесла заключэнне: пахаванні ў Шчакатоўскім лесе адносяцца да даваеннага часу. Менавіта тады на гэтым месцы дэмакратычнымі актывістамі і быў усталяваны першы крыж — у памяць ахвярам сталінскага рэжыму. Пазней з'явіўся мемарыяльны камень з надпісам «Пакутнікам тваім, Беларусь». Падаецца, на гэтым можна было б паставіць кропку.

Але абсалютна нечакана, у 2007 годзе да паўторных раскопак, праўда, у некалькіх кіламетрах ад таго месца, дзе праводзілася першая экспертыза, заступіў спецыяльны 52-і пошукавы батальён Міністэрства абароны. Ціхенечка, без сведак, былі раскапаныя дзве магілы. Тая акалічнасць, што вайскоўцы распачалі паўторныя раскопкі на месцы пахаванняў, выклікала абурэнне прадстаўнікоў дэмакратычнага руху: з якой мэтай спатрэбілася яшчэ раз варушыць спакой расстраляных людзей, ды яшчэ ў атмасферы поўнай сакрэтнасці? На месцы раскопак былі выстаўлены міліцэйскія кардоны. А незалежныя эксперты не былі дапушчаны да паўторнай эксгумацыі, не маглі назіраць за працэсам.

Па выніках «працы» вайскоўцаў нечакана ўзнікла новая, афіцыйная версія паходжання могільнікаў — тут пахаваны ахвяры не сталінскага, а нацысцкага рэжыму, людзей расстрэльвалі немцы падчас другой сусветнай вайны. Косткі забітых вырашана было перазахаваць у брацкай магіле разам з чатырма чырвонаармейцамі. Але па выніках раскопак судмедэкспертыза не дала заключэння наконт узросту пахаванняў і не зрабіла высноў па кулях, якімі расстрэльваліся людзі. На дадзены момант існуе дзве версіі знойдзеных пахаванняў. Па афіцыйнай версіі, нацысты расстрэльвалі апалчэнцаў і ваеннапалонных чырвонаармейцаў на пачатку вайны. Па другой версіі, сцвярджаецца, што тут адбывалася масавае знішчэнне людзей у часы камуністычных рэпрэсій.



Мемарыяльны камень ад мясцовых дэмакратаў

Прадстаўнікі дэмакратычнай часткі грамадства ўпэўнены, што раскопкі 52-га спецыяльнага батальёна — гэта спроба з боку ўладаў перанесці адказнасць за забойствы нявінных людзей з камуністычнага рэжыму на нацыскі.

Гомельскія грамадскія актывісты Андрэй Мельнікаў, Кастусь Жукоўскі і незалежны журналіст Павал Міцкевіч прымалі самы актыўны ўдзел у мемарыялізацыі «лесу смерці»: збіралі і запісвалі сведчанні рабочых, якія праводзілі ў гэтым месцы газапровад, апытвалі навакольных жыхароў, якія былі сведкамі забойстваў, звярталіся са скаргамі ў суд з патрабаваннем азнаёміцца з матэрыяламі паўторнай экспертызы. Разам з прадстаўнікамі беларускай грамадскасці яны ўсталёўвалі крыжы ахвярам палітычных рэпрэсій.

Нягледзячы на ўсе высілкі ўладаў засакрэціць ці сказіць факты па гэтай справе, з кожным новым днём прыадчыняецца завеса таямніц лесу. Нядаўна 85-гадовая жыхарка Гомеля распавяла Кастусю Жукоўскаму пра забойства свайго бацькі ў кастрычніку 1937 года і паведаміла такі факт: «Калі стала халадаць, забітых пачалі вывозіць з лесу і тапіць у забалочанай затоцы Сожа. Лета наступнага года было сухое, затока амаль высахла, і цэлая гара парэштак апынулася на паверхні. Падняўся вэрхал. НКУС нагнала тэхнікі і вайскоўцаў, і верагодна, зняволеных, і тыя засыпалі чалавечыя парэшткі зямлёй!»

Пазней, у 1980-я гады, земснарадам пашыралі раку і выпадкова на паверхню было выкінута шмат касцей. Тое, што пабачыла жанчына ў 1937-м, тлумачаць паходжанне безлічы выяўленых чалавечых костак на рацэ Сож.

«Ці атрымалі вы канчатковыя высновы паўторнай экспертызы?» — пытаюся ў Кастуся Жукоўскага.

«Не. Улады наўмысна робяць з гэтага таямніцу. — патлумачыў Кастусь, — І па некаторых дзеяннях з іх боку можна здагадацца, што справа мае палітычны характар. Так, кожны год падчас ускладання кветак мясцовымі грамадскімі актывістамі, а таксама падчас правядзення імшы каталіцкімі святарамі, невядомыя асобы ў чорным здымаюць усіх прысутных на відэа. Каталіцкія вернікі, якія ўжо 14 гадоў праводзяць на гэтым месцы імшу, у гэты раз былі папярэджаныя, што мерапрыемства немагчыма без заяўкі на правядзенне мітынгу. Па розных дадзеных (а гэта падлік расстрэльных ям, паказанні сведак, розныя факты знаходжання парэштак), па ўсяму лесу можа быць пахавана да 150 000 чалавек! — распавядае Кастусь Жукоўскі. — Адзін з памятных крыжоў быў усталяваны 2 лістапада 1994 года па ініцыятыве Гомельскага абласнога аддзела Беларускай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій пры дапамозе каталіцкага святара, ксяндза Славаміра на сродкі грамадскасці Гомеля. Крыж мае надпіс: «Адно з месцаў масавых расстрэлаў ахвяр бальшавіцкай дыктатуры ў перыяд 1919–1940-х гг.». Другі крыж быў усталяваны праваслаўнымі святарамі. Трэці — ад прадстаўнікоў Навабеліцкага райвыканкаму. Акрамя гэтага, мной і Андрусём Цянютам пры фінансавай падтрымцы мясцовых Аб'яднаных дэмакратычных сілаў былі ўсталяваны мемарыяльны камень».

У розных месцах «лесу смерці» ахвярам Беларусі ўсталяваны тры мемарыяльныя крыжы, адзін з іх зроблены ўладамі — на месцы паўторнай экспертызы.

А 6 лістапада 2010 года, акурат у Дзмітрыеўскую памінальную суботу, сябрамі стваремай партыі БХД (Мельнікавым, Клімовічам, Якавенкам і Сіваковым) у памяць пакутнікаў Беларусі быў усталяваны яшчэ адзін крыж, зроблены і пафарбаваны Кастусём Жукоўскім. Мемарыяльны знак сімвалічна вырашана было несці на плячах доўгай дарогай — на 9-ы кіламетр праз увесь горад. Праз тры дні планавалася асвяціць крыж, для гэтага на месца пакуты быў запрошаны праваслаўны святар. Аднак, прыбыўшы на запланаваную імшу 9 лістапада, актывісты і святар пабачылі, што мемарыяльнага знака няма. Кінуліся ў розныя бакі на пошукі і знайшлі крыж праз сотню метраў у засмечанай лесапаласе. Крыж быў пераўсталяваны і асвечаны.

З НАГОДЫ

# НА СЛУЖБЕ Ў Д'ЯБЛА

Аляксей ХАДЫКА

**Цікава жыць у краінах пераходнага перыяду, асабліва ў краінах шматнацыянальных, як Беларусь. Агульнавядомае габрэйскае шабатнае «Чакаем падзення першай зоркі» пачынае ўспрымацца па-за межамі вузкага нацыянальнага кола неяк па-свойму. Астранамічныя навукі, у сваю чаргу, уносяць у грамадзянскую свядомасць сваістае адценне. Нехта кажа пра вялікага палітыка: «Ён — наша сонца». А абазнаны школьнік ведае: сонца па астранамічным вызначэнні — жоўты карлік.**

У палітычных карлікаў, якія ўяўляюць сябе вялікімі зоркамі, у складаныя перыяды жыцця ёсць падпорка: спецыяльныя паліцэйскія фармаванні. Гэта звычайна спецыяльна натрэніраваныя і замбаваныя асобы, якія не надта задумваюцца, што ў зорак перыяд існавання абмежаваны.

У Іраку, дзе рэжым Садама Хусэйна падаваўся ці не вечным, рубіконам зрабіўся 2003 год, калі міжнародная супольнасць разам з патрыятычнымі нацыянальнымі сіламі паклала канец уладзе адной з самых пачварных палітычных постацяў XX стагоддзя. За часы панавання Хусейна бясследна зніклі ў безыменных магілах каля 1,5 мільёна чалавек. Армія Ірака складала на 2003 год 350 тысяч чалавек, у тым ліку 15 тысяч сіл бяспекі і 20 тысяч асабістай ахоўы дыктатара. Значная частка гэтых «легальных крымінальнікаў», аднак, была знішчана або асуджана, або збегла за мяжу, папоўніўшы тэрарыстычныя і бандыцкія групоўкі ў арабскім свеце, Еўропе і ЗША. Але ад неспакою і тэрору — спадчыны рэжыму Хусэйна — беглі і мірныя людзі. Камітэт па бежанцах ААН на 2008 год ацэньваў колькасць людзей, што пакінулі Ірак, у 2 мільёна, а тых, якія з'ехалі са сталага месца жыхарства ў межах краіны, — у 2,7 мільёна.

Калі 14 студзеня 2011 года пасля амаль 24-гадовага панавання Туніс пакінуў прэзідэнт Зін эль-Абідзін Бен Алі, чые метады знаходжання пры ўладзе беларусам знаёмыя да болю, на вуліцах пачалася сутычкі насельніцтва і лаяльных дэмакратычным зменам службаў бяспекі з былой прэзідэнцкай аховай і спецслужбістамі. Дыктатар не пакінуў краіну проста так. Ён даў загад сваім манкуртам тэрарызаваць народ, а з сабой у Саудаўскую Аравію, апошні прытулак злачынцы, прыхапіў 1,5 тоны золата. Лёс яго ланцуговых сабакаў незайздросны: каго не заб'юць на вуліцах або не пасадзяць, чакаюць тыя ж самыя панурыя бандыцкія закуткі па ўсім свеце.

У Беларусі пасля 19 снежня 2010 года высветлілася, што дзейснаму кіраўніку дзяржавы, які больш не абапіраецца ні на закон, ні на падтрымку народа, не хапае сіл бяспекі. Днямі быў абвешчаны набор у дататкавае Падраздзяленне міліцыі спецыяльнага прызначэння ў Мінскай вобласці. Як заявіў начальнік аддзела камплектавання ўпраўлення ідэалагічнай працы і кадравага забеспячэння УУС Міншчыны падпалкоўнік Аляксандр Брысюк, кожны кандыдат у прэзідэнцкія легіянеры атрымае багата льгот. Гэта і дзяржстрахоўка, і бясплатнае абмундзіраванне, і пенсія па дасягненні 45 гадоў. Да таго ж працяглыя адпачынкі, кампенсацыі выдаткаў па найму жытла (мінчукі не надта ідуць працаваць у спецаддзелы), і льготныя крэдыты. Нават магчымасць атрымліваць вышэйшую адукацыю ў Беларусі ці Расіі, калі хто з іх захоча.

Што ж чакае гэтых хлопчыкаў, а таксама тых, хто ўжо на службе, пасля фіналу, які будзе нагадваць ці кіргізскі, ці туніскі, ці які яшчэ варыянт — будзем толькі спадзявацца, што больш мірны за іракскі?

ПАДЗЕЯ

# ФЕСТЫВАЛЬ АДНАГО ВЕРША Ў МІНСКУ

Аляксей ХАДЫКА

**У Літаратурным музеі Янкі Купалы прайшоў фінал «Фестывалю аднаго верша–2010», падзеі, якая чацвёрты год запар робіцца заўважнай з'явай у паэтычнай прасторы Беларусі. Яе нязменнаму арганізатару, Георгію Барташу, загадчыку аддзела паэзіі літаратурнага партала «Точка зрения» (www.lito1.ru), гэтым разам удалося прыцягнуць да ўдзелу ў конкурсе 84 намінантаў з Беларусі, Расіі і Украіны.**



Журы

У папярэднія гады ўдзельнікаў было 37, 50 і 51 адпаведна. Зразумела, што на конкурс прадстаўляліся вершы як беларускамоўныя (у тым ліку з Расіі), так і рускамоўныя, хаця арганізатары не супраць запрасіць да ўдзелу і літаратараў, якія твораць па-англійску, па-нямецку, па-французску, па-шведску. Гэта, зрэшты, перспектыва, а рэаліі сённяшняга дня зводзяцца да таго, што ў Мінску ўпэўнена заяўляе пра сябе пляцоўка, дзе чарговы раз здымаецца супрацьстаянне літаратуры на дзвюх паноўных мовах нашай краіны па прынцыпе: галоўнае — якасць.

Сапраўды, на фестывалі было не сумна, пра што сведчыў і перапоўнены гасцямі салон музея і што мацаваў падбор разнастайных па стылістыцы, памерах і форме твораў. Ініцыятыва падобных чытанняў узнікла напрыканцы 1980-х гадоў у Мінскім педуніверсітэце пад кіраўніцтвам Георгія Барташа. Нешта падобнае з сярэдзіны 1990-х адбывалася ў Маскве, дзе літаратурна-публіцыстычны інтэрнэт-часопіс «Точка Зрения: современная литература в Интернете» (www.lito.ru) аформіўся як ініцыятыва музыкі Аляксея Каракоўскага з рок-гурта «Происшествие» і яшчэ 17 творцаў у 2000 годзе пасля прыкладна 5 гадоў нефармальнага супрацоўніцтва маладых музыкантаў, паэтаў і пісьменнікаў маскоўскага андэграўнда.

Потым былі конкурсы паэзіі, літаратурныя сустрэчы («Маскоўскія літаратурныя тыдні»), поспех якіх натхніў прыхільнікаў інтэрнэт-часопіса ў 2006 годзе стварыць творчыя аб'яднанні ў Маскве, Мінску, Адэсе, Ніжнім Ноўгарадзе, Пецярбургу і Іркуцку. Так і пачаўся мінскі фестываль аднаго верша.

У гэтым годзе рост колькасці ўдзельнікаў арганізатары тлумачаць наступнымі фактарамі: раскруткай інфармацыі праз Жывыя Часопісы сталых аўтараў праекта і падтрымкай Філатаўскім фондам сацыяльна-эканамічных і інтэлектуальных праграм (Сяргея Філатава, былога галавы адміністрацыі Ельцына) з Масквы.

Можа ўзнікнуць пытанне: а хто і як вызначае пераможцаў фестывалю, бо на ім называюць і прызёраў, і лаўрэатаў? Спачатку пра працэдуру: яна прадугледжвае ананімную падачу (пад нік-нэймам) аднаго верша, такім чынам, што сапраўдны кантакт з аўтарам мае толькі арганізатар. У журы ўваходзяць сталыя літаратары, кола якіх вызначылася цягам гадоў пры арганізацыі творчых сустрэч, на якія паэтычная моладзь па ўласным выбары запрашала сталых калег.

У гэтым годзе журы склалі Адам Глобус, Алесь Камоцкі, Андрэй Хадановіч, Віктар Шніп, Вольга Базылёва-Клімко (пераможца конкурсаў 2007 і 2008 гадоў), Дзмітрый Строцаў, Ларыса Рублеўская, Наталля Капа, Сяргей Пукст — паэт і музыка, і Юры Сапажкоў. Далей 10 сябраў журы падаюць свае «галасы» і «прызы». Другая намінацыя важнейшая, бо важыць болей і абавязвае «суддзю», у выпадку, калі намінаваны ім кандыдат атрымае больш у суму галасоў і прызоў, прадставіць пераможцу публіцы. Блаславіць, так бы мовіць, на творчы шлях у вялікі свет.

Цяпер пра вынікі. Прызёраў (хто атрымаў хоць адзін «прыз») у гэтым годзе 8. Але найбольшая сума — па 1 прызе і 3 галасах — у Міколы Кандратава (нік-нэйм «Язон», Мінск, голас ад Глобуса, прызы ад Сапажкова, Пукста і Капы) і Кірылы Анохіна («Слонік», Мінск, голас — Строцаў, прызы — Хадановіч, Камоцкі, Глобус).

Іх вершы варта прывесці цалкам:

***Мікола Кандратаў***
***Белыя змеі***

*паўзуць па скаванай марозам зямлі,*
*служкі зімнай завеі.*
*Белыя змеі*
*шыпеннем сягаюць да голых галін,*
*снежных дахаў і весніц.*
*Белыя змеі*
*замерзлае ссуць малако*
*з вымя рэк і азёраў.*
*Белыя змеі*
*імкнуць паасобку, то цэлым клубком*
*у халодныя норы.*
*Белыя змеі*
*над кожнаю згубленай летам душой*
*непадзельна ўладараць.*
*Белыя змеі*
*шукаюць за позняй начною мяжой*
*цёплай ахвяры.*

Максімальна лаканічны «мініяцюрыст» ***Кірыла Анохін***

*пагляд зі на зіму*
*і ніколі*
*так*
*не рабі*

Што да аўтара нататкі, то мне найбольш спадабаўся твор, які атрымаў тры галасы, аўтар якога ў выніку ўвайшоў у лаўрэаты. Гэта — ***Алёна Беланожка*** (галасы Рублеўскай, Строцава і Глобуса):

*Калі ты вымаеш сябе з зімы —*
*Крыху падсмажанай,*
*Крыху падснежанай,*
*Паблытаўшы дзверы жытла й карчмы,*
*Уваходзіш у дом да мяне, збянтэжанай —*
*Я выгінаю спіну на тонкім ільне:*
*Бяры мяне на рукі*
*І цалуй, і гушкай!*
*Калі ты вымаеш сябе з мяне,*



Алёна Беланожка

*Мне хочацца*
*Перавязаць цябе стужкай*
*І даслаць на Каляды жанчыне, якая*
*Не размешвае цукар у каве «па сонцы»,*
*Але носіць пярсцёнак і заўжды чакае.*
*Я вяртаю цябе*
*Благавернай жонцы.*
*Яна знойдзе цябе сярод серпанціна*
*І ляжа побач,*
*І ўчуе мой пах…*
*І нічога на скажа,*
*Бо ты — яе мужчына,*
*І зойдзецца стогнамі*
*У тваіх руках.*
*Львы на халаце замятляюць грывамі,*
*Задрыжаць іголачкі жытнёвага асця…*
*Я застаюся сам-насам*
*Са сваімі рыфмамі.*
*Я вымаю сябе*
*З твайго жыцця.*

Што тычыцца наступнага года — фестываль адбудзецца, звычайна адбор твораў пачынаецца ў кастрычніку-лістападзе. Сачыце за парталам і пытайцеся ў сваіх знаёмых маладых геніяў. Не забудзьцеся таксама, што, паколькі конкурс навагодне-калядны, як вы ўжо зразумелі, у вершы-прэтэндэнце абавязкова павінна гучаць тэма зімы.

ВЫСТАВА

# САЛІДАРНАСЦЬ

Вольга ХВОІН

**Перадача для дзяўчат, перадача для хлопцаў, паштоўкі, малюнкі, фотаздымкі і экспазіцыя турэмнай камеры. Усё гэта можна пабачыць у Мінску на выставе «Салідарнасць», прысвечанай падзеям 19 снежня 2010 года, калі адбыліся прэзідэнцкія выбары, разгон акцыі пратэсту і арышты соцень людзей.**

Адна з арганізатарак выставы — Алёна Валынец-Чарняева — распавяла, што такая ідэя з'явілася пад Новы год. «Было вельмі сумна, бязрадасна пасля тых падзей, але пачалі выходзіць на свабоду першыя людзі пасля «сутак». І мы хацелі зрабіць ім невялікі падарунак, каб яны на ўласныя вочы пабачылі салідарнасць людзей з імі. Прыкладна тыдзень таму мы пачалі збіраць экспанаты. У нас ёсць сярод экспанатаў кніга Фуко, якая ў 2006-м адседзела суткі першы раз, а цяпер — другі», — гаворыць Алёна Валынец.



Фота gazetaby.com

Пісьменнік Уладзімір Арлоў падчас адкрыцця выставы зачытаў сваё эсэ «Незалежнасць», напісанае ў 1990 годзе, але і праз 20 год, яно, на думку аўтара, «на вялікі жаль, не толькі не страціла сваёй актуальнасці, але яшчэ больш набыла яе ў нашых шыротах». «Мы павінны адказваць на пытанні: ці можа быць вольнай нацыя, якая не мае незалежнай дзяржавы, і ці можа дзяржава быць сапраўды незалежнай, калі нацыя нявольная, калі людзі ў гэтай дзяржаве не пачуваюцца сваімі на сваёй зямлі. Але я веру, што так калі-небудзь абавязкова будзе. І гэта залежыць ад усіх нас», — сказаў Уладзімір Арлоў.

На адкрыцці выставы прысутнічалі паэт Андрэй Хадановіч, музыка Лявон Вольскі, былі людзі з ліку тых, хто 19 снежня быў затрыманы і асуджаны да адміністрацыйнага арышту, яны дзяліліся сваімі ўражаннямі ад падзей, расказвалі пра іх падтрымку з волі. У дзень адкрыцця выставы невялікі офіс партыі БНФ быў перапоўнены людзьмі. Выстава «Салідарнасць» будзе працаваць да 31 студзеня, але інсталяцыя камеры будзе дэманстравацца толькі два дні.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 65

Падпісана да друку 21.01.2011. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.